*Пролетарыі усіх краін, еднайцеся!*

# ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

*ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР*

№ 34 (490) | Субота, 26 кастрычніка 1940 года | Цана 20 кап.

## Аб паэзіі

Своеасаблівасць гістарычнага працэсу развіцця беларускай літаратуры заключаецца, між іншым, і ў тым, што паэтычныя жанры заўсёды пераважалі ў ёй над прозай і драматургіяй. Фактычнымі асновапаложнікамі літаратуры беларускага народа з'явіліся паэты — Янка Купала і Якуб Колас.

Наяўнасцю гістарычных традыцый можна вытлумачыць той бясспрэчны факт, што іменна ў росце ўздыму беларускай совецкай паэзіі ярчэй за ўсё праявіўся рост і ўздым усёй беларускай совецкай літаратуры. Зборнікі вершаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Петруся Броўкі, Максіма Танка, Ф. Пестрака, А. Куляшова, Пятра Глебкі, П. Панчанкі, Эдзі Агняцвет з'яўляюцца паказальнікамі няўхільнага руху наперад, сведчаннем ідэйна-мастацкага росту беларускай совецкай літаратуры.

Незвычайна пашырыўся тэматычны кругагляд нашай паэзіі. У новым зборніку Янкі Купалы «Ад сэрца», у новай кнізе Якуба Коласа «Пад сталінскім сонцам» знайшлі сваё паэтычнае выражэнне найбольш важныя падзеі ў жыцці совецкага народа, яго радаснае і шчаслівае жыццё пад сталінскім сонцам. Народныя паэты складаюць дзівосны гімн найвялікшаму творцу чалавечага шчасця — роднаму Сталіну.

Соцыяльна-грамадская тэма, засвоеная арганічна, а не вонкава ці павярхоўна, прадстаўляе найшырэйшыя магчымасці для праяўлення ўсіх індывідуальных якасцей паэта. Вось чаму ў новай кнізе Якуба Коласа побач з вершамі на актуальныя палітычныя тэмы змешчан рад вершаў пейзажных, якія па сваёй маляўнічасці і выразнасці набліжаюцца да класічных пейзажаў «Новай зямлі» і «Сымона-музыкі». Паказваюць больш глыбокае і арганічнае авалоданне сучаснай тэмай новыя вершы Петруся Броўкі, сабраныя ў кнізе «Шляхамі баравымі».

Аб незвычайна ўзросшых магчымасцях нашай паэзіі сведчыць і факт стварэння паэтам Пятром Глебкам рамантычнай драмы ў вершах «Над Бярозай-ракой». Усіх зацікаўленых у росце нашай літаратуры не могуць не радаваць поспехі Аркадзія Куляшова, які ад кнігі к кнізе ідзе да ўсё больш дасканалых вершаў. У сёнешнім нумары нашай газеты друкуецца новы цыкл вершаў маладога паэта Пімена Панчанкі. У іх гучыць незвычайна чысты паэтычны голас, у якім адчуваюцца ноты сапраўднай чалавечай мужнасці.

Нядаўна выйшлі з друку зборнікі вершаў — першыя зборнікі, выданыя на шчаслівай совецкай зямлі, — Максіма Танка, Філіпа Пестрака і Ніны Тарас. Совецкая беларуская літаратура ўзбагацілася новымі паэтычнымі імёнамі.

Беларуская совецкая паэзія расце бурна і імкліва. Аднак, у працэсе яе росту выкрываецца і рад недахопаў ідэйнага і мастацкага парадку, абмеркаванне і перамаганне якіх з'яўляецца першачарговай задачай літаратурнай грамадскасці. Праходзячая зараз дыскусія аб паэзіі павінна была ўскрыць гэтыя недахопы. Нажаль, трэба прызнаць, што гэтага не адбылося, сапраўды творчай дыскусіі не выйшла.

У чым сутнасць дыскусіі? У тым, што тт. Кучар і Бярозкін, з аднаго боку, і т т. Глебка і Шахоўскі, з другога боку, разышліся ў сваёй ацэнцы новых вершаў Петруся Броўкі? Вядома, не ў гэтым. Сутнасць спрэчак заключаецца ў пошуках новых форм на шляху далейшага развіцця нашай паэзіі. Ва ўсякім выпадку, аб гэтым **павінен** быў быць разгавор.

У асобных вершах нашых паэтаў, асабліва маладых, страчана пачуццё часу. Гэта бясспрэчна. Калі мы гаворым аб пачуцці часу, сцвярджаючы наабходнасць яго ў паэзіі, мы вельмі далёкі ад яго вульгарнага разумення, якое заключаецца ў вонкавым прыцягненні адзнак часу. Мы патрабуем ад паэта адчування будуемага комунізма, пачуцця трывожнай насцярожанасці ад усведамлення разгараючайся сусветнай вайны, прычым перакананне ў немінучасці суровай схваткі з капіталізмам для нас не трагічна, яно не здымае радаснага адчування нашага шчаслівага часу. Мы патрабуем ад паэта страснай зацікаўленасці ва ўсім, што адбываецца на зямлі, мы патрабуем значных пачуццяў, якія-б у сваю чаргу актывізіравалі свядомасць чытача.

У нашай паэзіі благадушнасці, упіхаміранасці пачуццяў, гэткай замкнутасці чалавека ў сваім уласным шчасці — больш, чым нам гэтага-б хацелася. Трэба выхоўваць у народзе пачуццё мабілізацыйнай гатоўнасці, а нашы вершы, нажаль, гэта не заўсёды робяць.

Бясспрэчна і тое палажэнне, што ў нашай паэзіі яшчэ вельмі адчувальны штамп, што самыя розныя па тэмпераменту, па стылю, па характару паэты часцяком сыходзяцца на адным «агульным» вершы, у якім і трацяць сваю індывідуальнасць. Гэтым «агульным» вершам у апошні час быў верш прыродаапісальны, бузіральны, з нязначным элементам гумару. З прычыны крыўднага неразумення, гэты «модны» верш разглядаецца асобнымі таварышамі як чарговае адкрыванне лірыкі, якую яны і абараняюць ад крытычных пасягненняў. Мы за лірыку не толькі ў сэнсе вершаў аб каханні, аб прыродзе, а за лірыку, якая валодае ўсім багаццем тэм аб'ектыўнага свету, за лірыку, якая адгукаецца самым высокім і чыстым голасам на патрабаванні дня, — мы за лірыку Маякоўскага, які заставаўся барабанбітом за будучыню ў вершах аб совецкім пашпарце і ў вершах аб каханні.

Трэба смялей і глыбей ставіць і вырашаць пытанні беларускай совецкай паэзіі.



31 кастрычніка 1940 года спаўняецца 15 год з дня смерці выдатнага дзеяча партыі Леніна—Сталіна, кіраўніка і арганізатара ўзброеных сіл совецкай дзяржавы, слаўнага палкаводца Чырвонай Арміі **Міхаіла Васільевіча Фрунзе.**

**На здымку:** М. В. Фрунзе. Партрэт работы А. Валошына, выпушчаны маскоўскім выдавецтвам «Искусство». Рэпрадукцыя Г. Шыракова (ТАСС).

## Пісьменнікі вітаюць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР

З вялікім уздымам сустрэлі пісьменнікі Беластока Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб дні выбараў у мясцовыя советы дэпутатаў працоўных у заходніх абласцях рэспублікі.

— Быць актыўнымі агітатарамі за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, мабілізаваць мастацкае слова на паспяховае правядзенне выбараў, правесці ў гарадах і раёнах області, на фабрыках і заводах Беластока літаратурныя вечары, прысвечаныя магутнасці і адзінству шматнацыянальнага совецкага народа, — вось аднадушнае рашэнне пісьменніцкай грамадскасці.

На сваім сходзе пісьменнікі вылучылі ў абласную выбарчую камісію дэпутата Вярхоўнага Совета СССР паэта Ф. С. Пестрака.

## Лекцыі аб творчасці А. Міцкевіча

У сувязі з набліжэннем 85-й гадавіны з дня смерці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча на заводах, фабрыках, у навучальных установах Беластока адбываюцца вечары, лекцыі і даклады, прысвечаныя жыццю і творчасці паэта. У клубе пісьменнікаў крытыкі Б. Марк і Г. Вольпе прачытаюць даклады аб жыццёвым і творчым шляху выдатнага паэта-дэмакрата, аб яго вялікай дружбе з Пушкіным, з дэкабрыстамі.

Для кіраўніцтва падрыхтоўкай да 85-годдзя з дня смерці Міцкевіча Беластоцкі абком КП(б)Б стварыў юбілейную камісію, у склад якой увайшлі сакратар абкома КП(б)Б тав. Сямёнаў, дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР тт. Прытыцкі і Пестрак, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага Польскага тэатра Аляксандр Венгерка, польская пісьменніца Я. Бранеўская, артыстка Польскага тэатра Бароўская, мастак Ляндау, крытык Вольпе і інш.

*Урывак з аповесці „Фрунзе"*

# У ШТАБЕ МІЛІЦЫІ

★

*Е. Садоўскі*

★

— Прывядзіце арыштаванага, — сказаўшы гэта, Фрунзе паправіў просты салдацкі шынель, накінуты на плечы, прысунуў сваё крэсла бліжэй да стала і ў чаканні паглядзеў на дзверы.

Была сакавіцкая раніца 1917 года. За вокнамі займалася зара і радасна ззяла на шыбах. Вясна 1917 года была асаблівай: сонца раней звычайнага пачало саграваць зямлю, ператвараючы снег у вясёлыя ручаі. Усюды адчувалася вялікая ўрачыстасць і лікаванне прыроды.

Чацвертага сакавіка жыхары губернскага горада Мінска, вышаўшы на вуліцу, былі ўсхваляваны незвычайнай карцінай. На рагу вуліц Захараўскай і Губернатарскай, на Саборнай плошчы, ля вакзала, дзе раней чынна прахаджвалі гарадавыя ў чорных шынелях і барашкавых шапках з какардамі велічынёй з кулак,—у гэту раніцу іх не было. Прывыклі бачыць іх тут. Ведалі павадкі і нораў кожнага. Адзін п'е, другі за соценную добра схавае бяспашпартнага, трэці, уразаючыся ў гушчу дэманстрантаў, б'е ножнамі шаблі па галаве, па плячах: бязлітасна да крыві... І раптам гарадавыя зніклі.

Навіна гэта хутка абляцела горад, і нават тыя, хто не меў ніякай справы на Саборнай плошчы, прышлі туды, каб пераканацца ў гэтым. А потым ішлі к вакзалу, к губернатарскаму саду, на Ляхаўку і, сустракаючы ўсюды натоўпы, пераконваліся, што гэта праўда.

— Фараонаў больш няма на пастах... Ура!—размахваючы фуражкай, крычаў рабочы гарбарнага завода Сальмана, і худы твар яго ззяў шчасцем.

Людскія натоўпы не разыходзіліся да позняга вечара. Разам з усімі пераходзіў з вуліцы на вуліцу, прагна прыслухоўваўся да разгавораў, падкаваў у знак згоды, крычаў «ура» прыземісты аброслы салдацік у патрапаным шынелю і пакамечанай папасе. Ён толькі-што выйшаў з шпіталя пасля тыфу і выхад на вуліцу быў для яго падвойным святам. У шпіталі яшчэ нічога не ведалі аб рэволюцыі, таму, убачыўшы на вуліцах натоўпы з чырвонымі сцягамі, Аўсянікаў, не верачы сабе, спыніўся. Потым, даведаўшыся, што гарадавых знялі з пастоў і разграмілі паліцэйскі ўчастак, ён вельмі ўзрадаваўся. Як п'яны, хадзіў ён па вуліцах уразаўся ў гушчу натоўпаў, і калі на прывакзальнай плошчы пачаўся мітынг, ён упершыню ў жыцці, кінуўшы вобземлю паху і не пазнаючы свайго голасу, гучна закрычаў:

— Салдаты вітаюць рэволюцыю!

Гэта простая фраза нібы ўзняла народ. З усіх бакоў пацягнуліся да Аўсянікава рукі, і ён нават крыху спалохаўся. Натоўп падхапіў яго і з крыкамі «ура» пачаў качаць. Потым Аўсянікаў апынуўся па другім канцы горада, дзе таксама было людна. Народ наглядаў тут за зменай пастоў.

Невысокі мужчына ў салдацкім шынелю з грубага сукна і ў зашчытнай фуражцы, падперазаны шырокім рамянём, з рэвальверам на баку, вёў за сабою дзесяць узброеных чалавек. Яны былі розных узростаў: студэнты ў форменных фуражках, рабочыя з чырвонымі павязкамі на рукавах. Праціснуўшыся бліжэй, Аўсянікаў пачуў словы: «Народная міліцыя».. і зразумеў, што адбываецца расстаноўка першых пастоў.

— Той, што ў шынелю, мусібыць, галоўны,—сказаў, ні да кога не звяртаючыся, стаяўшы побач з Аўсянікавым стары.

Выклікаўшы з строя правафлангавага, старшы,—а гэта быў Фрунзе,— каротка і ясна растлумачыў яго абавязкі:

— Рэволюцыя давярае вам гэты пост. Вы адказваеце за парадак у навакольным раёне. Недапушчальны грабяжы, эксцэсы...

Аўсянікаў не адрываў воч ад Фрунзе. Дзе ён бачыў гэтага чалавека? Так, гэта ён, але тады ён быў маладзейшы, бародкі не было, але голас—голас той-жа спакойны, пераканаўчы, гучны. Ды гэта-ж Міхайлаў!— раптам успомніў ён. Зрабіўшы крок наперад, ён па-салдацку чотка паставіў нагу і, прыклаўшы руку к папасе, сказаў:

— Гасп...—і тут-жа паправіўся: — Таварыш начальнік, радавы 444 палка 3-й арміі Аўсянікаў, Міхаіл Кузьміч, мае чэсць...

Фрунзе павярнуўся і, ласкава пахлопаўшы салдата па плячу, адразу сагнаў з яго нясмеласць і няўпэўненасць:

— Гавары, гавары, дружа!

— Таварыш начальнік, — бліскаючы вачыма, гаварыў Аўсянікаў, адчуваючы незвычайны прыліў сіл:—гляджу я на вас і хачу праверыць, ці не абазнаўся я? Ці не будзеце вы Міхайлаў, які ўзімку прыязджаў у 3-ю армію і гутарыў з салдатамі?

Фрунзе ўсміхнуўся:

— Не, дружа, ты не памыліўся.—І ён працягнуў салдату руку.—А ты што тут робіш?

— З шпіталя выйшаў, таварыш начальнік.

— Ранілі? — спагадліва спытаўся Фрунзе.

— Ды горш, брушняк у акопах схапіў...

— Зараз куды, на фронт ці дадому?

— Дадому?—перапытаў Аўсянікаў. Яму здалося, што ён не пачуў.—А ці-ж можна?

— А за каго-ж ты ваяваць будзеш? Раманавых ужо няма...

Аўсянікаву, нязвыкламу да пяшчот, захацелася кінуцца на шыю гэтаму роднаму і блізкаму чалавеку. Ён схапіў Фрунзе за руку і пачаў моцна ціснуць яе... З вялікай спагадай наглядалі гэту сцэну міліцыянеры і, забыўшыся, што яны знаходзяцца ў страю, бліжэй падышлі да начальніка.

— А ты дзе спыніўся? — спытаў Фрунзе.

— Ды пакуль нібы і нідзе...

— Ды вось, калі хочаш, далучайся да іх, — Фрунзе кіўнуў галавой у бок міліцыянераў. — Мы ахвотна прымаем салдатаў. Нам патрэбны адданыя народу людзі...

— Ёсць! — прызвычаена чотка адказаў Аўсянікаў і, зрабіўшы шырокі крок наперад, заняў месца на левым флангу.

***

Ад'ютант, — у ім лёгка было пазнаць Аўсянікава, ён, праўда, памаладзеў, збрыў вусы і ў новым фрэнчы выглядаў неяк вышэй, — ад'ютант адчыніў дзверы і, адышоўшыся ў бок, прапусціў арыштаванага. Тоўсты, азызлы паліцэйскі спалохана азірнуўся вакол і, цяжка дыхаючы, падышоў да стала.

Фрунзе ўстаў. Чацвёртая бяссонная ноч паклала адбітак на яго твар, пабляднелі шчокі. Не было часу пабрыцца, ён аброс, але Фрунзе прывык сілай волі перамагаць стомленасць. Трэба было зрабіць некалькі крокаў па пакоі, каб зноў адчуць сябе свежым і бадзёрым.

Разбраенне царскай паліцыі, у свой час выпеставанай любімцам цара Курловым, прайшло амаль бяскроўна. Самая галоўка паліцыі ўцекла ў Магілеў, дзе знаходзілася царская стаўка. Да Фрунзе дайшлі чуткі, што там мяркуюцца правакацыйныя забойствы міліцыянераў, каб застрашыць народ і ахаладзіць цягу да службы ў Чырвонай Міліцыі. «Госці» з Магілева не прымусілі сябе доўга чакаць і ўначы на Мінскім вакзале быў затрыман тоўсты, бочкападобны паліцэйскі Сафронаў, пераапрануты пад чыгуначніка. Яго пазналі яшчэ па дарозе ў Мінск, пазналі вызваленыя з турмы рэволюцыянеры, якіх ён у свой час арыштоўваў. У дарозе яны нічым не выказалі свайго «знаёмства», а калі поезд спыніўся ля Александраўскага вакзала ў Мінску, Сафронаў быў перададзен у рукі міліцыі. І вось цяпер стаяў ён перад начальнікам Мінскай міліцыі.

— Ну, сядайце, смялей, смялей. Вы дзе служылі ў паліцыі? У Магілеве?

— Я не маю ніякага дачынення да паліцыі, я чыгуначнік, — адварачваючы галаву і нібы ні да каго не звяртаючыся, адказаў арыштаваны.

— Вы ў якой службе працавалі на чыгунцы?—нібы згаджаючыся з толькі-што сказаным, спытаўся Фрунзе.

Арыштаваны замяўся.

— Я чыноўнік...

— Пачакайце, пачакайце. Я вас не аб гэтым. На чыгунцы ёсць служба цягі, служба руху... Вы дзе працавалі?

Арыштаваны маўчаў.

— Для чаго вас жандармерыя стаўкі накіравала ў Мінск? Я чакаю... Адказвайце...—Фрунзе падышоў да стала і пільна глянуў у вочы арыштаванаму.

— Я чыноўнік чыгункі,—нібы па-завучанаму паўтарыў арыштаваны.

— Крыху не так... Аўсянікаў!

— Слухаю вас.

— Паклічце сюды магілеўскіх таварышоў.

Фрунзе кінуў мімалётны, нібы выпадковы позірк на таўсцяка. Той пры гэтых словах пабялеў і відаць было, як на яго твары спалохана задрыжалі мускулы.

Рэзка ўздыхнуўшы, нібы з сілай захапіўшы паветра, арыштаваны сказаў:

— У Магілеве...

— Значыць, вы служылі ў паліцыі ў Магілеве? Кім?

Аўсянікаў увёў у кабінет двух пажылых людзей, сівавалосых, з чырвонымі бантамі на грудзях.

— Вы ведаеце гэтага чалавека? — запытаў Фрунзе ў першага.

— Лепш-бы мы яго не ведалі,—кіўнуўшы галавой, адказаў той.—Сафронаў — паліцэйскі важак у Магілеве. Магу паказаць таварышу начальніку крывавыя сляды ад удараў нагайкай, удараў, нанесеных рукой гэтага ката.

—Доўга служылі ў паліцыі?—сядаючы на крэсла, спытаўся Фрунзе ў арыштаванага.

— Дванаццаць год...

— Са стажам, значыць... Навошта прыехалі ў Мінск? Гэта ваш браўнінг? — і Фрунзе, зняўшы газету, паказаў на рэвальвер, што ляжаў на стале. «За верную службу Сафронаву» — прачытаў Фрунзе на рукаяці — Рэвальвер падняла ў тую хвіліну, калі пасля арышту вы паспрабавалі непрыкметна «згубіць» яго. Ваш рэвальвер... На першы раз хопіць... Аўсянікаў, хто там чакае мяне ў прыёмнай?

— Салдаты, таварыш начальнік, больш за дваццаць. Прышлі паступаць у міліцыю.

— Вось і добра, вось і выдатна, прасі калі ласка. І, забыўшыся на стомленасць, Фрунзе ўстаў з-за стала і працягнуў рукі насустрач уваходзячым салдатам.

*П. Панчанка*

## ПЕРШЫЯ КУЛІ

Нябачная першая куля
    ля вуха злавесна свісне,
Зямля ў нябёсы дзьмухне
    крывавай віхурай гранат,
Барвовая душная хмара
    над ціхім акопам нявісне,
Таварыш паранены войкне —
    і ты зразумееш: вайна.
Маланкай мільгнуць успаміны:
    далёкая вёска... дзяўчына...
Ты слухаеш у трывозе,
    як верба ад страху дрыжыць.
І хочаш зрасціся з зямлёю,
    зрабіцца маленькай пясчынкай.
Зарыцца ў чабор духавіты,
    замерці, дыханне стаіць...
Ты бачыш перад вачыма
    агеньчык маленькай кветкі.
Мурашка з нікчэмнай здабычай
    пабегла кудысьці наўцёк,
Усё, што ты ботамі трушчыў,
    усё, што было непрыкметным,
Варушыцца, звоніць, спявае
    і праслаўляе жыццё.
І з самых таемных глыбіняў,
    з расплаўленых вогненных нетраў
Прыходзіць загад суровы:
    «Устань, чалавек, пагляздзі!
На родны свой край,
    на поле,
        абмытае сонцам і ветрам,
За ўсё, што стварыў ты і створыш,
    у бітву адважна ідзі».
І вецер твой рот разрывае
    страшэнным бязгучным крыкам.
Пружністую і тугую
    зямлю патлынуў агонь.
Бяжыш ты насустрач кулям,
    разгневаны і вялікі,
І тупат пяхотных дывізій
    спяшыць за табой наўздагон.

**Беласток, 1940.**

## ПРА СМЕРЦЬ

Не хачу паміраць я са стогнам і хрыпам
Ад нікчэмнай прастуды, ад таннага грыпа.
Увявіце малюнак...
    Імгліцца дожджык.
Зямля разбухла ад дожджавых дрожджаў.
І скрыпяць галамагі хаўтурнай калёсы
Скрозь нечыя енкі, размовы і слёзы.
І хтосьці, каго за бяздарнасць я лаяў,
Здымае капелюш з журботнасцю мілай,
Пра добрае сэрца маё завывае,
Слязой фальшывай паганіць магілу...
Прашу —
    ганіце ад трун роўнадушных!
У іх-жа нямала рублёвых клапот.
Ад іх ліцамер'я і мёртвым становіцца
        душна,
Ад нудных прамоў нават нябожчык кідае ў
        пот.
А не — дык я сам разламаю труну
І з магілак іх турну.
Чаго разышоўся я ў пеннай ярасці?
Да смерці-ж далёка, не блізка да старасці!
Не такім-бы пабачыць мне дзень свой
        апошні.

Я жадаю, каб быў ён за ўсе
        шчаслівейшым,
Каб на сход развітальны былі запрошаны
Мае справы, і мары, і вершы.
Каб усё, што любіў я, чым край мой
        багаты,
У той дзень да мяне заглянула ў хату.
Каб вянкі прамяністыя з руж і язміну
Упрыгожылі сцены, падлогу і вокны,
І ад пахкага мёду, ад сонечных вінаў
Гладышы, і бутэлькі, і кубкі размоклі...

Я клікну — і кліч разнясуць сады:
— Прыходзьце ка мне ўсе,
Каго я вучыў, каго я лячыў,
    Каго ратаваў з бяды.
З кім я у час франтавы начаваў
У хмурым слонімскім лесе,
З кім я нямала пераспяваў
Вясёлых і сумных песень,
Хто мяне першым падтрымаў
На коўзкіх усходцах паэзіі.
Хай будзе праслаўлен той дзень і час,
Што шлях падвядзе мой жыццёвы,
Калі я пачую, сябры, ад вас
Суровыя простыя словы:
«Ты рук на працы не шкадаваў,
Не ныў, не стагнаў ад зморы,
Ты шчасце з народам сваім будаваў —
І нам за цябе не сорам».

А потым, без слёз, без нуды, непрыкметна
сесці ў снарад ракетны
і паляцець-бы дарогай бясконцай
у вогненную ляпу сонца.

**Ст. Талочын, 1940.**

## ЗУБР

Мне сніўся зубр паміж высокіх хвой.
Бывала вейкі цяжкія заплюшчу —
І ён з вачмі, налітымі крывёй,
Прыходзіў да мяне з далёкай пушчы.

А ў жыцці — складаней і грубей,
Дзіцячы сон знікае, як памылка...
Касіршы соннай кідаю рубель,
З патайным трапетам іду у стан асілка.

У пыльным закуце, схіліўшы галаву,
Стаіць вялізарны, чырвона-чорны,
Зубамі жоўтымі грызе-жуе траву.
Ляны і па-кароўяму пакорны.

Што сталася з табой, магутны бык,
Дзе сілу, спрыт і ваяўнічасць страціў?
Чаму не ўсхопішся як віхар на-дыбы?
За выгляд твой аж сорамна мне, браце.

А, ведаеш што, зубр, давай-ка уначы..—
Я памагу... Не бойся, нас не чуюць, —
Гайда туды, дзе спеў драздоў гучыць:
На папараці мяккай заначуеш.

Ты-ж нудзішся па соснах маладых,
І пушчы без цябе таксама сумна.
Прыпомні, друг, юнацкія гады,
Зуброўну — белавежскую красуню.

Маўчыш? Спалохаўся? Шкада пакінуць
        сад?

Ну, што-ж, маўчы і стой у хлеве
        душным.

Плятуся раззлаваны я назад,
А зубр услед глядзіць мне роўнадушна.

**Гродна, 1940. Зоапарк.**

## Сход секцыі паэтаў

Пасля доўгага перарыву, 19 кастрычніка адбыўся, нарэшце, сход паэтычнай секцыі ССП БССР. У справаздачы аб рабоце бюро секцыі П. Броўка адзначыў, што секцыя працавала слаба. За год было праведзена некалькі сходаў паэтаў, на якіх былі абмеркаваны творы Э. Агняцвет і А. Жаўрука. Дадатным у рабоце секцыі тав. Броўка лічыць тое, што паэты падрыхтавалі і выдалі аднатомнік выбраных вершаў В. Маякоўскага на беларускай мове, здалі ў друк у перакладзе на беларускую мову аднатомнік вершаў М. Лермантава, які выйдзе ў Дзяржаўным выдавецтве БССР да юбілея паэта. Паэт А. Куляшоў пераклаў на беларускую мову «Еўгенія Онегіна» А. С. Пушкіна, заканчваецца работа над перакладам «Віцязя ў тыгравай скуры» Шота Руставелі.

У выніку слабай работы і адсутнасці ўвагі секцыі як да творчых пытанняў, так і да ідэйнага выхавання паэтаў, у газетах і паасобных выданнях часта друкаваліся нізкаякасныя, халтурныя вершы. Тав. Броўка адзначыў, што паэты да гэтага часу не ўключыліся ў дыскусію аб паэзіі, якая вядзецца на старонках газеты «Літаратура і мастацтва». Між тым, спрачацца ёсць аб чым.

У спрэчках па справаздачы П. Броўкі прынялі ўдзел тт. М. Лужанін, К. Цітоў, Я. Журба, Г. Шведзік, Х. Мальцінскі і інш. Усе яны гаварылі аб тым, што работу секцыі трэба падначаліць абмеркаванню творчых пытанняў, новых твораў і зборнікаў да іх здачы ў Дзяржаўнае выдавецтва, пытанням выхавання здольнай літаратурнай моладзі, аказання ёй творчай дапамогі.

На сходзе было выбрана новае бюро секцыі паэтаў у складзе тт. А. Куляшова, Э. Агняцвет і Г. Шведзіка. Адказным сакратаром бюро выбран А. Куляшоў.

## Я. Купала і Я. Колас ў Беластоцкім педінстытуце

У дзень заканчэння работы выязной сесіі Акадэміі навук БССР у Беластоку акадэмікі—народныя паэты Янка Купала і Якуб Колас наведалі Беластоцкі педагагічны інстытут. Студэнты і выкладчыкі наладзілі сардэчную сустрэчу любімым паэтам.

Дырэктар інстытута літаратуры і мовы акадэміі тав. Барысенка расказаў аб творчасці паэтаў, расквітнеўшай пад сонцам соцыялізма, аб іх новых творах. Янка Купала прачытаў вершы «Калыханка», «З новай думкай», «Наша моладзь», «Час быў тады», Якуб Колас — вершы «Вольнаму народу», «Шчаслівым жанчынам», «На новай зямлі», «Радасная сустрэча».

Гэта сустрэча пакінула ў студэнтаў і выкладчыкаў педінстытута незабыўнае ўражанне.



**«Франтавікі ў таварыша Фрунзе ў Мінску, 1917 год».** Карціна мастака З. І. Мірынгофа, экспаніруемая на выстаўцы «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Рэпрадукцыя І. Каплінскага.

Абмеркаванне новых твораў

# АБ КУЛЬТУРЫ ПРОЗЫ

## Раман М. Паслядовіча „Паўстанне“

★
*Г. Бярозкін*
★

Не будзем гаварыць аб высокіх і складаных праблемах стылю, жанру, майстэрства. Пачнём хоць-бы з таго, што прывядзём асобныя прыклады штампаванай мовы, узоры **агульнага, прыблізнага** ўяўлення аб рэчах.

У «Паўстанні» М. Паслядовіча ёсць такое месца: палкоўнік Свяніцкі разам з акупанцкай арміяй белапалякаў прыязджае ў Савецкую Беларусь і наведвае палац, які належыў да рэвалюцыі яму. Палкоўнік прыходзіць у шаленства. У рамане аб гэтым сказана так: «Свяніцкі, **як тыгр, кідаўся з пакоя ў пакой**» (стар. 149).

Увявім сабе на мінуту такі дослед. Тысячы чалавек, валодаючых сярэднім, звычайным узроўнем мастацкай культуры, даецца задача: паказаць словамі стан раззлаванага, раз'юшанага чалавека. Няма сумнення, што добрая палова ўдзельнікаў гэтага выбражаемага эксперымента так і скажа: «Свяніцкі (ці чалавек з іншым прозвішчам), як тыгр, кідаўся...» і г. д., і т. п. Існуюць нейкія паўныя нормы агульнадаступнага літаратурнага абіходу, і вышэй названая фраза вельмі добра ўкладваецца ў іх. Тут, як кажуць, усё ў парадку, усё нармальна.

Незразумела толькі, як можна пры дапамозе гэтай кананізіраванай бытам, даўно апрацаванай, страціўшай жывы сэнс, штампаванай фразеалогіі напісаць раман у дзевяць з паловай друкаваных аркушаў, ды яшчэ разглядаць гэты раман як самастойны мастацкі твор. Тут ужо стварэнцца становішча яўна ненармальнае.

Сапраўдны пісьменнік ні ў якім выпадку не можа быць у ліку той тысячы чалавек, якой адна і тая-ж мысль, адно і тое-ж вызначэнне, адна і тая-ж метафара прыходзіць у галавы адначасна. Толькі тое мае права бытаваць у творы мастацтва, што самастойна вылучана вокам, слыхам, памяццю, выабражэннем мастака. Дапусціць, што літаратура развіваецца ў межах пастаянных, аднойчы знойдзеных, замацаваных традыцыяй выяўленчых сродкаў, значыць — не зразумець выказвання Леніна аб мастацкім развіцці чалавецтва, не зразумець мыслі аб канкрэтных формах чалавечага пазнання, увасобленых у мастацтва. Зрэшты, і аб гэтым не абавязкова гаварыць у сувязі з новым раманам М. Паслядовіча, настолькі ён грашыць супроць элементарных патрабаванняў мастацкай культуры.

Пачаць хоць-бы з асноўнага: з падыходу да тэмы. У нас нямала твораў, прысвечаных тэме герaічнай барацьбы беларускага народа з белапольскай акупацыяй. Гэта тэма па-сапраўднаму хвалюе творчае выабражэнне беларускіх савецкіх пісьменнікаў.

У рамане М. Паслядовіча вельмі мала новага ў падыходзе к тэме. Разам са старой тэмай сюды перанесены і старыя метады яе вырашэння. Атрымліваецца нейкае прыгнечваюча-настойлівае паўтарэнне старых, раней засвоеных сцэн і сітуацый.

Ва ўсіх творах аб барацьбе з белапалякамі прысутнічае вобраз беларускага кулака, якога палякі, прышоўшы ў вёску, назначаюць войтам. Рэальная расстаноўка класавых сіл у вёсцы абумовіла паяўленне гэтага персанажа. Ёсць ён і ў рамане «Паўстанне». Гэта баязлівы, прагны, паслужлівы Корбут. «Мы прызначаем вас за войта, пане Корбут, — сказаў Свяніцкі хутараніну. Гэта ганаровая пасада...» (стар. 21). Чытаючы гэта месца, як і многія іншыя месцы ў рамане М. Паслядовіча, цяжка вызваліцца ад уражання, што ўсё, што расказвае пісьменнік, табе добра знаёма, засвоена з іншых кніг, спектакляў, кінофільмаў. Усё гэта ўжо аднойчы было. У рамане М. Паслядовіча «Паўстанне», у якім, дарэчы сказаць, не ўсё аднолькава бледна і бясцветна, літаральна пужае тая беспярэчнасць і пакорлівасць, з якой малады пісьменнік давяраецца чужым уражанням, чужым, не ім самім народжаным мыслям і словам.

I Корбут, і Свяніцкі, і партызаны — усе яны маглі і павінны былі застацца героямі рамана, калі-б не былі так прасталінейна і так наіўна вырашаны. I галоўнае: калі-б у іх была прыкмета самастойнасць мастацкага мышлення аўтара. М. Паслядовічу-ж яўна нехапае самастойнасці і спеласці мастацкай культуры.

Рамантычныя прыгоды Віктара і Мішкі, якія самі раззбройваюць польскую часць і прывозяць зброю партызанам, вельмі нагадваюць аналагічныя прыгоды «чырвоных д'яваля т». М. Паслядовіч яўна змяншае цяжкасці барацьбы з акупантамі. У яго рамане белапалякі і іх прыслугачы — гэта жалкі зброд фізічных выдракаў, вадэвільных камедыянтаў, нікчэмных фразёраў, крываж:эрных ізвергаў. Задача савецкіх пісьменнікаў заключаецца ў тым, каб паказаць ворага ва ўсёўзброенні яго класавых ідэй; за фігурай ворага павінен быць відзен той свет, па якому трэба весці агонь. М. Паслядовіч-жа паказвае ворагаў такімі, якімі маленькія дзеці ўяўляюць сабе «белых», «буржуяў»: з воўчымі клыкамі, з палаючымі вачамі. «Гамулька (беларускі міністр), **як воўк**, пазіраў на той бераг. Вочы яго ўспыхвалі **то крывавым агнём**, калі полымя пажараў шугала ў неба, то свяціліся **зялёным фасфарычным бляскам**, калі пажар канчаўся» (стар. 90—91). Гэта прымітыўная, так сказаць, фізіялагічная дыскрэдытацыя ворага нічога супольнага не мае з мастацкім паказам варожага свету.

Вось асобныя прыклады з рамана «Паўстанне». Беларускі нацыяналіст Гамулька, «выціраючы хустачкай пот з тлустага твару **прагугнявіў**» (стар. 31); «супакойцеся, панна Гелена, — прамовіў **ён гугнявым голасам**» (стар. 26); «цудоўна, цудоўна, — **прагугнявіў** міністр, напраўляючы акуляры на круглым, **як бульбіна**, носе» (стар. 63); «візаві тоўсты чалавек у шэрым суконным касцюме, у чорных акулярах на круглым, **як бульбіна**, носе (стар. 26); «крэсла... грукнулася аб **напоўнены абвіслы жывот** міністра», «у вялізным неруховым **жываце** беларускага міністра **нешта булькала і хліпала**» (стар. 279).

Гэта аб адным адмоўным персанажы. А вось аб іншых: «Запалыя вочы Цырковіча (беларускага нацыяналіста—**Г. Б.**) зірнулі кудысьці ў бок, **рэдкая казліная бародка** застыгла ў нерухомасці» (стар. 186); «разам з безліччу страсных слоў на яго бараду, па празрыстае шкло пенснэ густа **запырскала сліна**» (стар. 190); «падхаружы, які быў трохі апіх, зноў **зароў, як звер**» (стар. 13); «холера ценжка! — **шыпеў** капітан Марушчак» (стар. 39); «дзесяць хвілін тэрміну! — **зароў** ён (белапаляк—**Г. Б.**): «што гэта такое?— шапталі з нейкім **страшэнным прысвістам** губы тоўстага афіцэра. **Дзікае** шаленства маланкай лятала ў яго маленькіх вочках. Наліты **барвовай чырванню** твар сударгава **ўздрыгваў** нават самай маленькай часткай» (стар. 87); «Гамулька зарагатаў так моцна і так дзіка!» (стар. 97); «у Корбута была **доўгая і худая, як таран**, дачка Фэлька» (стар. 74); «**доўгія і худыя, як тараны**, паненкі», «другая з **конскім тварам** шыкнула», «**бычыная** шыя ўлана» (стар. 274) і г. д., і т. п.—аднастайна тыя-ж казліныя барадкі, барвовыя твары, хрыпатыя басы бясконца, без меры.

Мы наўмысля не паляніліся выпісаць вялікую колькасць цытат, каб нашы словы аб нізкім узроўні мастацкай культуры не засталіся пустой фразай.

М. Паслядовіч мысліць вельмі прымітыўна. Для яго ўся сацыяльная рэчаіснасць, як абітальнікі дзеляцца на «чырвоных» і «белых». Уся складанасць сацыяльных супярэчнасцей зводзіцца да вельмі няхітрай барацьбы кровежэрных і адначасна вельмі жалкіх, нікчэмных (накшталт Гамульскі) ворагаў з ангелападобнымі Токаравымі.

Токараў—гэта старшыня рэўкома, арганізатар партызанскага руху, бальшавік. Пасля прачытання рамана М. Паслядовіча ў памяці ад Токарава застаюцца толькі «гарачы позірк», «сівыя вусы», «высокі лоб» і «маузер»— г. зн. уся сукупнасць ідэальных, манументальна-абагуленых рысаў, ствараючая не жывую чалавечую асобу, а казачнае абліччa, жалезабетонную маску. Токараў увесь час, на працягу ўсяго рамана, памяркоўны і спакойны. На 60-й старонцы ён ведае, што будзе на 200-й. У яго асаблівая дагаворанасць з падзеямі. Ні аднаго жывога слова не гаворыць Токараў на працягу ўсяго рамана.

Наўнасць мастацкага сазнання М. Паслядовіча ярчэй за ўсё сказалася ў апошнім эпізодзе рамана—эпізодзе прадажы беларускім нацыяналістам Гамулькай лесу французу Пішэгру. У гэтай сцэне аўтар хацеў мастацка ўвасобіць тую агульнавядомую ісціну, што беларускія нацыяналісты—верныя паслугачы сусветнага імперыялізма—агулам і ў розніцу распрадавалі Беларусь. Для таго, каб вобразна паказаць гэту ідэю, М. Паслядовіч рысуе рэальны беларускі лес, у якім і адбываецца гандлёвая здзелка паміж гугнявым Гамулькам і мас'е Пішэгру, сімвалізіруючым увесь замежны капітал... Ідучы па такому шляху прымітыўнай расшыфроўкі агульных палажэнняў, агульных ідэй, можна ствараць чахлыя алегорыі, а не жывыя мастацкія вобразы.

Алегорыямі, штампамі, агульнымі словамі перапоўнен раман «Паўстанне». «Дзякую злосцю гарэлі яго чорныя вочы», «бліскаючы вачыма, поўнымі нянавісці», «сурова-патрозны бляск вачэй гарманіста», «вочы гарэлі ўсё тымжа неспакойным агнём», «злыя аганькі гарэлі ў вачах», «зайздросныя агеньчыкі забегалі ў яго чорных вачах» і г. д. І побач з гэтымі ўмоўна-мастацкімі «агеньчыкамі ў вачах» сустракаюцца і афіцыяльныя звароты, накштaлт: «Магчыма, праз гэты апошні тэзіс і выйшла пазней такая нечаканая для Віктара сутычка за яго **ініцыятыву**» (стар. 43).

М. Паслядовіч—пісьменнік, безумоўна, адароны. Ён ведае сялянскі быт, мае багатыя назіранні над сялянскім жыццём. I ў яго атрымліваецца добра тады, калі ён парушае сваю наіўную соцыялагічную схему і піша аб тым, што ведае, бачыць і любіць у жыцці. Так, напрыклад, добрыя тыя месцы рамана «Паўстанне», у якіх паказана, як па загаду польскага камандавання Буйневіч выязджае ў воласць на страката размаляванай фурманцы. Адчуваюцца першыя абрысы чалавечага характару ў фразе ,сказанай аб Потапу: «Пракураны параховым дымам сусветнай вайны, аблазіўшы з вінтоўкай у руках Карпацкія горы, ён верыў толькі ў тое, што бачыў сваімі вачыма» (стар. 64). Выразны вобраз «пана Малецкага» — хлопчыка Стася. Але ўсе гэтыя вобразы — добрыя безадносна да цэлага, так сказаць, па-за агульным замыслам, добрыя самі па сабе.

Далейшае творчае развіццё М. Паслядовіча будзе залежаць ад таго, наколькі паспяхова ён здолее перамагчы ўладу штампа, уладу мастацкага бескультур'я. Жывая плодатворная чалавечая мысль—вось што з'яўляецца асновай сапраўды-мастацкай культуры. I аб ёй, вось, у першую чаргу абавязан паклапаціцца М. Паслядовіч.

# Слова ў дыскусіі

★
*М. Клімковіч*
★

Сутнасць дыскусіі, узнятай П. Глебкам і А. Кучарам, заключаецца ў вызначэнні далейшых шляхоў беларускай савецкай паэзіі. Паэт Глебка сцвярджае, што наша паэзія стаіць на правільным шляху, што яна адыходзіць ад вонкавага паказу чалавека і пераходзіць да раскрыцця яго ўнутранага свету, яго думак і пачуццяў. Такім чынам, па думцы паэта, паэзія наша ўжо сёння больш глыбока і больш правільна адлюстроўвае рэчаіснасць, а гэтым самым становіцца больш спелай і больш цікавай для чытача. Крытык Кучар, паглыбляючы думкі, аднойчы выказаныя тав. Бярозкіным (у артыкуле «Дружба і «дружба»), сцвярджае адваротнае. Па думцы крытыка, наша паэзія трапіла ў палон «лірычнага штампу», нашы паэты перасталі быць арыгінальнымі, згубілі пачуццё часу. Як адзіны ратунак з такога катастрафічнага становішча, крытык прапануе «скідаць цывільныя манішкі і гальштукі і апранацца па-вайсковаму».

Па думцы Глебкі, наша паэзія ў далейшым можа развівацца і развіваецца сваім, так сказаць, натуральным шляхам, усё далей адыходзячы ад рыторыкі, ад вонкавага паказу рэчаіснасці і паглыбляючы раскрыццё ўсіх пачуццяў новага савецкага чалавека. Паводле Глебкі, пачуцці паэта-грамадзяніна, яго асабісты ўдзел у грамадскім жыцці і вопыт, набыты на ўласнай творчасці, адрэгулююць патрэбныя суадносіны паміж інтымнай лірыкай і вершамі, якія ставяць войстрыя грамадскія праблемы (якія, дарэчы, таксама могуць быць глыбока лірычнымі). Як на доказ гэтага, Глебка спасылаецца на апошнія вершы П. Броўкі. Але па гэтыя-ж вершы спасылаецца і Кучар — у доказ правільнасці сваіх вывадаў. Тут міжволі ўспамінаецца старая народная казка, як сем братоў праўду шукалі і падышлі да яе з сямі розных бакоў. Адзін бачыў праўду гарой высокай, другі — ракой шырокай, трэці — барамі непраходнымі... У канцы казкі браты б'юцца між сабою, спрабуючы кулакамі давесці, што-ж такое праўда.

А праўда заключаецца ў тым, што для вырашэння пытання аб шляхах беларускай паэзіі патрэбна было-б прыцягнуць больш шырокі матэрыял: паэзію Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, маладых паэтаў — Пімена Панчанкі і інш. Кучар-жа бярэ паэзію статычна, так сказаць, без кораня і цвету, а калі і бачыць які-небудзь рух, то толькі ўшыркі. Да таго-ж, не ў прыклад маладым крытыкам, ён пазбаўлен адчування новага і мае вока, наметанае на «ўлаўленне» негатыўнага, ценевага. Адсюль такая лёгкасць у абагульненнях асобных адмоўных з'яў літаратуры. Сам крытык, відаць, разумее хісткасць сваіх пазіцый, бо спяшаецца прызнаць, што ў беларускай паэзіі ёсць і творы «глыбокія па думцы і пачуццю, авеяныя сапраўднай паэзіяй, прасякнутыя разуменнем самых складаных адценняў у пачуццях людзей і ў прыродзе». Аднак загадзя ўзятая ім для ўсёй паэзіі мерка прымушае яго так дэталізіраваць гэтыя вершы, абстаўляць іх такімі агаворкамі, што ад усіх «авеяных» застаецца толькі шэрая пляма: «лірычны штамп», заназычанасць, «трохі суму, трохі гумару».

Наўрад ці знойдзе крытык хаця-б аднаго паэта, у творчасці якога, хаця-б сабе і на працягу аднаго года, пераважалі «песні салаўёў» над грамадска-палітычнымі матывамі. Благадушная заспакоенасць у нашай паэзіі цалкам выдумана крытыкам, нават калі браць толькі тыя творы якія ён разглядае.

Нізка вершаў А. Куляшова «Юнацкі свет» пранізана думкай аб неабходнасці абараняць мірную працу, шчаслівае савецкае жыццё ад знешніх ворагаў. Нават самая «мірная» з паэм Куляшова — «У зялёнай дуброве» мае ў сабе і матывы, і настроі, і вобразы, якія потым больш шырока разгортвае Куляшоў у паэме «Хлопцы апошняй вайны». Дарэчы сказаць, думка аб тым, што «нам ёсць і што абараняць і чым абараняць» на працягу апошніх год чырвонай ніткай праходзіць праз усю творчасць Куляшова. У гэтым сэнсе «Хлопцы апошняй вайны» не намнога пасунулі паэта наперад. Тыя далёкія апасрэдстваванні, якія ўжывае Куляшоў для перадачы сваіх пачуццяў, не далі яму магчымасці ні перадаць магутнага гневу нашага народа ў часе свяшчэннай вайны, ні сапраўдных пачуццяў, якія агарнулі-б байцоў Чырвонай Арміі над целамі забітых таварышоў. Вобраз «неразумнага» салдата і адзіны завет загінуўшых чырвонаармейцаў: «глядзіце на свет і маімі вачамі» — занадта пасіўны, каб паказаць гэтыя пачуцці. Таму гэта паэма не можа лічыцца пераломнай нават для Куляшова, а не то што для ўсёй беларускай паэзіі. Тым больш, што ў Куляшова нехапіла ведаў, каб уявіць сабе, як будзе адбывацца апошняя вайна, якія сілы яна ўзніме ўнутры капіталістычных краін, і малюнак апошняй вайны аказаўся бледным. Куляшоў шукае формы і наўрад ці будзе правільным арыентыраваць яго на замацаванне той формы, у якую ён увасобіў пакуль-што няўдалы, сыры нелепрацаваны верш «Хлопцы апошняй вайны».

Не давалі падстаў для абвінавачвання нашай паэзіі ў залішняй благадушнасці і вершы П. Броўкі. Нават беглы прагляд зборніка «Шляхамі баравымі» пакажа, што ўвагу паэта прыкоўваюць хутчэй падзеі грамадска-палітычнай значымасці, чым асабістыя інтымныя перажыванні. Значыць, і тут «упраўляць мазгі» без таго, каб не атрымаць у адказ зусім разонную параду: «врачу—исцелися сам»—не прыходзіцца.

Што-ж непакоіць крытыка? Чаго ён гвалтуе: «Безадкладна пераапранайце паэзію»?

Аказваецца, крытык убачыў галоўную, нават смяртэльную небяспеку для беларускай паэзіі ў дзесяці, ад сілы пятнаццаці вершах аб каханні, аб рыбаловах. Якжа мала трэба, каб да такой ступені напалохаць такога храбрага і ваяўнічага крытыка!

Спаткаўшы на кустах беларускай паэзіі некалькі мірна насвістваючых салаўёў, крытык падняў лямант, нібы ўбачыў сотню ўдаваў, і тут-жа аб'явіў усеагульную мабілізацыю. А якімі толькі сродкамі не карыстаўся скромны крытык, каб дыскрэдытыраваць ледзь чутны лірычны пасвіст! — I салаўі вы, маўляў, несапраўдныя, і голас, маўляў, пазычан вамі ў Шчыпачова і Твардоўскага... Крытык паклікаў нават у сведкі цені Пушкіна і Багдановіча, каб выкрыць Броўку ў злачынстве крадзяжу... у аднаго — формы застольнай песні, у другога — вобраза мяцеліцы. Праўда, сведкі маглі-б самі паспрачацца, пазнаючы ўкрадзеную мяцеліцу, бо і ў таго і ў другога было іх па некалькі. Відаць, не спадзяючыся перацягнуць на свой бок вялікіх лірыкаў мінулага, ды яшчэ ў паходзе супроць лірыкі! — Кучар выклікае з будучыні свайго патомка, спадзяючыся, што ён будзе менш чулым да лірыкі: — Ці пазнае наш далёкі патомак, што гэта рулада салаўіная, г. зн. лірычныя вершы, спявалася ў часе другой імперыялістычнай вайны, калі салаўям было мною строга загадана спяваць толькі падражаючы кулямёту?.. Не ведаю, што адкажа будучы патомак шаноўнага крытыка, але мне здаецца, што калі яму па закону спадчыннасці не перадасца глухата яго продка да лірычнага радка, ён са здавальненнем прачытае і «Мяцеліцу», і «Паляванне» і «Гэты кветкамі-пухам абсыпаны сад».

Тут мы падыходзім да самага галоўнага абвінавачання нашай лірыкі: яна не носіць на сабе пячаткі часу. Прагледзеўшы цыкл вершаў Куляшова і зборнік Броўкі, мы, сапраўды, знайшлі некалькі вершаў, на якіх гэта пячаткі «не пастаўлена», аднак гэта былі вершы з лірыкай «на ўсю моц» (пяжка з непрывычкі выгаварыць новыя літаратуразнаўчыя тэрміны тав. Кучара!), вершы, якія Кучару якраз падабаюцца. Астатнія вершы насілі і вонкава (што менш важна), і па пачуццях, якімі яны былі авеяны, выразную адзнаку нашага савецкага часу. «Вуліца Маскоўская» прасякнута любоўю нашага народа к чырвонай сталіцы, «Бюро даведак» выражае пачуцці юнака, наведаўшага сямігодку праз некалькі год пасля скончання вучобы ў ёй. I калі-б нават каханая з «Бюро даведак» не была ў юнгштурмаўцы, мы ўсё-такі пазналі-б час, аб якім піша паэт. Мне здаецца, што нават лірычнае «Паляцім? — Паляцім!», як і пчолы ў «Гэты кветкамі-пухам абсыпаны сад» у Броўкі, больш адбівае наш час, чым падказваемая Кучарам маладым закаханым людзям фраза: — Паляцім на самалёце, ды яшчэ на трохматорным бамбардыроўшчыку...

Усяму свой час і сваё месца. Жыццё ў той час, калі гэта будзе патрэбна, пасадзіць абодвух закаханых на баявы самалёт, а зараз дазвольце паэту поруч з баявым вершам аб загінуўшых пад Гродна байцах напісаць проста лірычны верш аб каханні. Думаю, што лірычныя радкі, якія раскрываюць жыццёрадаснасць новага чалавека, паказваюць нашу шчаслівую рэчаіснасць, таксама ўзмацняюць жаданне абараняць гэта жыццё, а за межамі — робяць нашымі прыхільнікамі большую колькасць людзей, чым дрэнныя вершы на самую «ура-абаронную» тэму. Кучар быў-бы праў у сваёй трывозе, калі-б ён даказаў, што тое, што яму здаецца, ёсць у рэчаіснасці і ў такіх памерах, як яму здаецца. Ён-жа пакуль што даказаў толькі верпасць пагаворкі: «У страха вочы вялікія». Чырвонаармейцы, якія ў часе кароткіх перапынкаў на фінскім фронце чыталі лірычныя вершы, — самыя лепшыя абаронцы лірыкі ад Кучара.

I зараз паўстае пытанне: ці быў звон?

Звон, разумеецца, быў. Ёсць у нас асобныя вершы перайманыя, трафарэтныя, ёсць неабходнасць напамінаць нашым паэтам аб баявых песнях, аб баявых вершах, напамінаць, што мы жывем у капіталістычным акружэнні. Толькі-ж і надрыў у гэтым напамінанні, паніка, якая прарываецца ў Кучара, не патрэбны і, проста сказаць, шкодны.

Партыя вучыць нас кожную з'яву разглядаць у яе канкрэтнасці, ухіляючыся ад неабгрунтаваных абагульненняў, інакш мы патрапляем у цяжкія абдымкі трафарэту. У нашай крытыцы таксама стварэцца трафарэт. Частка нашых крытыкаў кожную літаратурную з'яву спрабуе разглядаць спрошчана, падганяць яе пад загадзя ўзятую думку. Захацелася крытыку, каб уся літаратура ілюстрыравала яго думку аб несамастойнасці ці несастаяцельнасці лірыкі, ну і пачынаецца падгонка матэрыялу, хоць матэрыял не лезе, супраціўляецца. Такая крытыка дае магчымасць даказаць усё, што заўгодна, але такая крытыка падрывае давер'е да сябе. Тым больш, калі крытык, засланіўшыся модным шчытом, хваліць у аднаго тое, што ён-жа ганіць у другога.

Я за суровую крытыку, якая джае не на словах, а на справе дапамагаць літаратуры, дасканала і без праузятай думкі разбіраючы літаратурныя творы. Я за крытыку, якая ведае жыццё, якая можа параўнаць твор не толькі з абмежаванай колькасцю вядомых ёй літаратурных з'яў, але і з самім жыццём. Усякая другая крытыка будзе жангліраваць сотнямі агаворак і карысці літаратуры не дасць.

*Да 35-годдзя літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы*

# АБ РАННІМ КУПАЛЕ

★
*Е. Янкелевіч*
★

У адным і тым-жа 1882 годзе нарадзіліся два буйнейшых паэты Беларусі—Янка Купала і Якуб Колас. Амаль адначасна выйшлі і іх першыя творы: «Жалейка» Купалы (1908) і «Песні жальбы» Коласа (1910). Здаецца, нібы разбуджаная громам 1905 года заснежаная беларуская вёска паслала ў літаратуру двух сваіх «хадакоў — двух лепшых сваіх людзей, самых праўдзівых і самых таленавітых, каб яны «за ўсіх» расказалі аб яе горы і галечы. Але ў прыгнечаным, змучаным народзе таілася столькі сілы, а ў яго песнях столькі паэзіі, што гарачае слова землякоў адразу паслужыла заклікам да барацьбы і з таго часу ўжо ніколі не забывалася. Так нараджалася рэвалюцыйная паэзія Беларусі —яе самая сапраўдная класіка.

Жыццёвы шлях Івана Луцэвіча (сапраўднае прозвішча паэта) у многім растлумачвае грамадзянскую стойкасць Янкі Купалы. Назаўсёды засталіся ў памяці паэта доўгія годы, калі ён араў, касіў і рубіў, і той самы чорны з іх, калі разам памерлі бацька, брат і малодшыя сёстры. Пасля іх смерці Купала пайшоў шукаць «свайго хлеба». «Гэтак праслужыў тры годы,—піша ён у сваёй аўтабіяграфіі, — у броварах. Зазнаў там такога пекла, якога яшчэ не меў». Бровары адыгралі ў жыцці Купалы прыкладна такую-ж ролю, як булачная Сямёнава ў біяграфіі Горкага. Купала не забыўся на іх і тады, калі 24-гадовым юнаком апынуўся ў Вільні бібліятэкарам, а потым супрацоўнікам газеты «Наша Ніва». З таго часу пачалася — спачатку ў Вільні, потым у Пецербургу і Мінску нястомная творчая работа: пераклады украінскіх, польскіх, рускіх паэтаў (у тым ліку ўзорны пераклад-пераладжанне «Слова аб палку Ігаравым»), рэдагаванне журналаў і рукапісаў і самае галоўнае між усіх спраў—стварэнне многіх томаў выдатных паэтычных твораў.

Купала ніколі не забываў, што ён пасланы ў літаратуру патрабаваць «зямлю і волю». У часы «безвременья», калі паводле справядлівых назіранняў Горкага мацнела рэвалюцыйная свядомасць шырокіх мас і большасць рускай інтэлігенцыі са страхам адмаўлялася ад ранейшых ідэалаў, традыцыі слаўнага мінулага працягвалі маладыя літаратары Беларусі і Украіны. Гэта былі традыцыі рэалізма і Горкі, не вагаючыся, ставіў дастойных прадаўжальнікаў у прыклад рэнегатам. «У Беларусі, — пісаў ён,—ёсць два паэты: Якуб Колас і Янка Купала — вельмі цікавыя рэбяты. Так прымітыўна, проста пішуць, так ласкава, сумна, шчыра. Нашым-бы хоць крыху гэтых якасцей. О, госпадзі, вось-бы добра было». Якая меткая гэта характарыстыка! Як пацвярджаецца яна лепшымі вершамі Купалы, такімі, як «Дзве бярозы», «Адцвітанне», альбо славутая «Наша вёска»:

Горы ды каменне,
Вузкія палоскі:
Гэта наша поле,
Поле нашай вёскі.
Курныя ваконцы —
Каб святла хоць трошкі,
Гэта нашы хаты,
Хаты нашай вёскі.
Лапці ды сярмягі —
Як абраз не боскі:
Гэта нашы людзі,
Людзі нашай вёскі.
Карчмы ды астрогі,
Крыжыкі, бярозкі:
Гэта наша доля,
Доля нашай вёскі.

Але ў гэтай сумнай пэшчотнасці няма і намёку на прымiранасць. Купала зусім не хоча ўвекавечваць пасевы «вераб'ю па калена» і даждлівыя пейзажы «з двума тычкамі хрэваў». Наадварот, ён увесь імкнецца ў будучыню. І як толькі ўзнікае гутарка аб долі селяніна, голас яго мужнее і мацнее. Гэта вызначае адносіны самага фальклорнага з паэтаў да народнай творчасці. Здаўна захаваўшыяся культавыя вобразы ён перапрацоўвае ў рэвалюцыйна-дэмакратычным духу. У народзе пяецца: жніво падобна бойцы. І Купала не раз звяртаецца да касцоў з заклікам, вартым Шэўчэнкі: «Ці дождуся калі кос і песень касцоў на другой, на вялікай касьбе». У народзе пяецца аб перамозе вясны над зімой. І ў 1908 годзе паэт заклікае не баяцца надыходзячых хмар: «Не пужайся, што здрадныя хмары неба ўслалі з канца да канца». І канчаецца верш так, нібы нечы другі мужны голас сцвярджае сэнс паўтору: «Яшчэ прыдзе вясна!». Гэты другі голас—адзін з характэрных прыкладаў своеасаблівай перапрацоўкі фальклору. Нібы настойліва падкрэсліваючы адну якую-небудзь ноту, Купала ў межах музыкальнага рэфрэна дабіваецца максімальнай інтанацыйнай і лагічнай перакананаўчасці. Такога эфекту дабіваецца ён, па-майстэрску перамагаючы аднастайнасць прыпеву ўжо ў першым сваім надрукаваным вершы «Мужык» пры дапамозе так-званага дэмі-рэфрэну. Восем разоў узапар паўтарае паэт, іранічна згаджаючыся са справядлівасцю суджанай яму долі: «Бо я мужык, просты мужык»; але калі ў прадапошняй страфе гутарка заходзіць аб тым, што ягоная горкая праца ўсё-ж велічна, Купала знаходзіць патрэбным адпаведна змяніць рэфрэн: «Ніколі браткі, не забуду, што чалавек я, хоць мужык», а ў заключэнне, скідваючы іранічную маску выпростваючыся на ўвесь свой велічны рост, ён заканчвае са спакойнай упэўненасцю: «Я буду жыць, бо я мужык». Вядома, такога яснага разумення аб неабходнасці адпаведнасці рэфрэна развіваючайся ідэі верша ў народнай паэзіі няма. Нам здаецца, што тут адначасна ў мастацкіх і агітацыйных мэтах выхадзец з беларускай вёскі прывіў народнай паэзіі прыём паэтаў-розначынцаў 60-х год.

Ва ўсякім выпадку, прыклад з рэфрэнам вельмі паказальны. Устанавіўшы змястоўнасць гэтага наватарства ў галіне формы, мы маем права заключаць і аб прагрэсіўнасці поглядаў і яснасці рэалістычнага позірку Купалы. Апошняе праяўляецца, перш за ўсё, у тым, што паэт ясна бачыць класавую дыферэнцыяцыю беларускай вёскі. Учарашні мужык, робячыся старастам, становіцца эксплататарам. Разам з пісарам, папом, панам і жандарам ён уваходзіць у лік варон, якіх вельмі многа, але якіх, нажаль, няма каму страляць (верш «І як тут не смяяцца»). Аб эксплаатацыі гаворыць Купала суровай прозай. Факт паказан у лічбах, бо яны мацней любых метафар («За гадзін семнаццаць працы ў дзень нязменна выйдзе грошаў дваццаць альбо й таго меней»). У эпоху «навьих чар» і «громокипящих кубков» Купала, прадаўжаючы некрасаўскую лінію, расказваў аб тым, як паны «походя бьют кулаками». Мужык, поле якога здратаваў град, дарэмна моліць пана аб пазыцы. Мужыка выкідваюць з хаты. Нашчадкі памёршага памешчыка адбіраюць у мужыка зямлю. Як і ў Некрасава, паказана ўсё гэта ў Купалы надзвычай жыва, з падачай дыялогаў, з каляровымі апісаннямі. Рад змрочных здымкаў з натуры, нарысы альбо фельетоны ў вершах заслужылі тое-ж пачэснае для Купалы ганьбаванне, якому некалі паклоннікі «чыстай паэзіі» падвяргалі Некрасава. І ўсё-ж, як любяць гаварыць сучасныя літаратуразнаўцы, Купала зусім не Некрасаў. Дзядзюшку Якава, як любога іншага чалавека, названага па імені вялікім рускім паэтам, няцяжка ўявіць сабе і цяжка зблытаць з кім-небудзь другім. Наадварот, Юлькі, Янкі, Васількі ў Купалы зусім умоўнае азначэнне. Так можна назваць любога беларускага селяніна. Таксама і любая трагедыя сялянскага жыцця расказваецца толькі ў самых агульных рысах. Ясней за ўсё гэта ўласцівасць Купалы праяўляецца ў апісанні пейзажаў і жаночай прыгожасці. Чорныя косы, белы тварык, сінія вочы—гэткае народнае ўяўленне аб прыгажосці, замацаванае ў пяземенных эпітэтах. Купала, як і ўсякі паэт, цесна звязаны з «суцэльным» неіндывідуалізіраваным, невылучаючымся народным мышленнем, верны гэтай фальклорнай традыцыі. Таму жывапісны элемент у творчасці Купалы—з'ява другарадная, затое музыкальна-рытмічны складае душу яго паэзіі.

Буйнейшы беларускі паэт М. Багдановіч адзначае ў «Нашай Ніве» багацце рыфмоўкі Купалы. Сугучнасць, якая праяўляецца ў сярэдзіне радка, якая адцяняе паралелі і кантрасты, паглыбляе цэзуры і, нарэшце, гучыць у канцы радка. Гэта-ж адносіцца да ўсіх відаў інструментоўкі і да рознастайных рэфрэнаў. На розныя лады настрайваў Купала сваю жалейку, каб выканаць вялікі плач беларускага сяла. Ён нідзе не высоўвае сваёй асобы на першы план. Усёроўна, хто плача і—больш таго—аб кім іменна з беларускіх сялян гаворыць песня. Сёння выкінулі з хаты Сцяпана, заўтра тое-ж можа здарыцца з Васільком. Гэта тыповыя, але агульныя для ўсіх «гісторыі», аб якіх з вялікім сумам гаворыць вуснамі Купалы беларуская вёска. Але нярэдка, калі слёзы нараджаў гнеў, верш Купалы атрымліваў вялікую акрэсленасць. І тады Купала ставіў у прыклад аднасяльчанам тых, хто змагаецца за лепшае будучае. Але нідзе «тыя, што змагаюцца» не названы па імені. У слоўніку Купалы нідзе не было слоў «горад», «рабочы», «машына», «фабрыка», «стачка» і г. д. Да тых, хто змагаецца, дарэвалюцыйны Купала адносіўся заўсёды з вялікай пашанай, але амаль не мог уявіць іх сабе, таму аб рэвалюцыі ён гаварыў ці як аб новым паўстанні ўзброеных косамі мужыкоў, ці як аб нейкім светлым святе.

І ў другой кнізе сваіх вершаў—«Гусляр» Купала прыходзіць у госці к сімвалістам. Уся сімвалісцкая астраномія з зорамі, сонцамі, заходамі і ўсходамі зручна размяшчаецца на старонках яго зборніка. Але сімвалісты не прынеслі вялікай школы Купалу. Ён хутчэй успрыняў іх паэтыку, чым ідэалогію.

Ад фальклорнага мышлення было два шляхі: альбо выхоўваць у сабе вайстрыню рэалістычнага погляду, ісці па шляху Шэўчэнкі і Некрасава, вучачыся бачыць нават у эпоху рэакцыі нарастанне багатых пудоўнымі і грознымі вынікамі супярэчнасцей, альбо апранаць свае асабістыя пачуцці і жаданні ў пышныя адзенні метафар. І, як не дзіўна, ад фальклору аказалася лягчэй прыйсці, па відзімасці, да тэматыкі і бясспрэчна да паэтыкі сімвалістаў, чым да горкаўскай пазіцыі рэалізма. Рэалізм патрабаваў ведаў, размышленняў, тэарэтычнага вопыту. Горкі невыпадкова — здарма поруч з пахваламі ўжыў слова «прымітыўна» прыстасоўна да творчасці абодвух буйных беларускіх паэтаў. Гэта прымітыўнасць мела аб'ектыўныя падставы. Ні беларускае сялянства, ні паэт у гэты час не мелі канкрэтных ведаў, тэарэтычнага вопыту. А без іх, не ўяўляючы сабе дакладна ролі рабочага класа пасля 1905 года, нельга было правільна намеціць і задачы сялянства ў справе ніспрыынуцця царызма. Заставалася толькі марыць аб гэтым. Але таму, што Купала па натуры быў занадта рэаліст, каб трымаць патрэбнае за існуючае, дык у кнізе паяўляюцца ноты глыбокага песімізму, якія ў наступных зборніках — «Шляхам жыцця» і «Спадчына» дасягаюць трагічнага напружання. Гэткія вершы «Цёмнае царства», «Смейцеся», «Магільшчык» і многія іншыя.

Магільшчыкі ў гэтых вершах капаюць яму ўсяму — чалавеку, сялу, Беларусі. Каб выратаваць краіну, трэба ў купальскую ноч сарваць чароўную кветку і знайсці скарб. У гэтай сімвалічнай апрацоўцы фальклорнага матыву крылася небяспека. Подзвіг выратавання, вызвалення рабіўся справай аднаго чалавека, месіі.

І Купала, які называў сябе раней «вераб'ём над Гайнай», цяпер па-бальмантаўску велічае сябе сонцам, сокалам, альбо прарокам. Але з новым нарастаннем рэвалюцыйнай хвалі эпідэмічная хвароба праходзіць. Вельмі цесна адчуваў сябе Купала звязаным з сялом, вельмі многа было ў ім здаровага сялянскага сэнсу і сапраўднай любві да радзімы, каб стаць эгацэнтрыкам, індывідуалістам. Нават калі ў «Шляхам жыцця» Купала пісаў штампаваную фразу аб тым, што «лучшая праца не небыцця», ён тут-жа рэалістычным параўнаннем матывіруе гэту прагу. Бо сялянскае жыццё, гэта сухавей, які гуляе з зернем. Не бачыць-бы гэтага жыцця, пайсці-б ад «апаганеных магіл» продкаў на волю. У сімвалісцкім «Сну на кургане» у русалак—біяграфіі салдатак, жанок, пакінутых на волю лёсу, якія ад беднасці дайшлі да забойства нованароджаных і праституцыі.

Жыццё прымушала рваць з сімвалісцкімі канонамі, і самая неадпаведнасць формы і зместу побач са стварэннем чыста рэалістычных твораў, як паэма «За чужую душу» у тым-жа «Гуслярах», сведчыць аб тым, што Купала паспеў для поўнацэннай рэалістычнай творчасці.

# У МАЙСТЭРНІ МАСТАКА

Ужо каля года рад маскоўскіх мастакоў рыхтуецца да ўдзелу ва Усебеларускай мастацкай выстаўцы: «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Шмат працуе для выстаўкі, узмоцнена рыхтуецца да яе вядомы жывапісец Фёдар Модораў.

На трэцім паверсе асабняка мастакоў на Верхняй Маслаўцы — майстэрня № 20. Сцены завешаны безліччу палотнаў: партрэты, эцюды, эскізы, вялікія сюжэтныя карціны... Навакол звычайныя для мастацкай майстэрні прадметы, якія паказваюць на тэму, над якой у даны момант працуе мастак. На вешалцы красачныя беларускія хусткі, паясы, каляровыя спадніцы. Усё гэта патрэбна Модораву для дэталей карціны, над якой ён працуе ўжо год. А вось і сама карціна — плод доўгай творчай працы. Яна займае ледзь не поўсцяны. І зараз мастак з кісцю ў руках адточвае дэталі.

Мастак заканчвае карціну «Народнае Сабранне працоўных Заходняй Беларусі».

...Гаворыць Сяргей Прытыцкі. Ён выйшаў на трыбуну Народнага Сабрання, каб выразіць думы і спадзяванні вызваленага беларускага народа, які жадае, па прыкладу сваіх савецкіх братоў, жыць і працаваць пад чырвонымі зоркамі Крамля... Аб гэтым гаворыць Прытыцкі, і ў мінуту натхнёных слоў аб устанаўленні Савецкай улады яго адлюстраваў мастак.

Побач з трыбунай стаіць стары селянін. Для яго сёння светлы радасны дзень. На першай лаўцы сядзіць дэпутат-рабочы, і ён не адрывае вачэй ад трыбуны, баіцца прапусціць слова. Блізка ля трыбуны, увесь захоплены будучым, якое ў радаснай перспектыве адкрылася, нарэшце, для працоўных Заходняй Беларусі, сядзіць настаўнік Абрам Машэвіцкі. Пачуццё задаволення відаць на твары ткача Гнядэка, яго таварыша па прафесіі — ткачыхі Марыі Дзьячук.

Перш чым прыступіць да палатна, тав. Модораў зрабіў шмат эцюдаў. Яны тут-жа, у майстэрні, кожны эцюд з'яўляецца своеасаблівай карцінай. Вось партрэты Гнядэка Прытыцкага, Дзьячук і многіх другіх добра знаёмых нам дэпутатаў.

Адначасова з работай над гэтай карцінай Ф. Модораў будзе пісаць яшчэ адно палатно аб Народным Сабранні ў Беластоку і ўжо зараз падрыхтоўвае творчы матэрыял для гэтага палатна.

Для рэспубліканскай выстаўкі ў Мінску тав. Модораў, апрача палатна «Народнае Сабранне», дасць некалькі партрэтаў знатных людзей БССР.

С. ЕФІМАЎ.

Масква.

## Хоры да Кастрычніцкіх святаў

Харавыя калектывы Беластоцкай вобласці актыўна ўключыліся ў падрыхтоўку да святкавання 23-й гадавіны вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Вывучаюцца лепшыя песні савецкіх кампазітараў.

Папулярны ў Беластоку хор абласнога Дома народнай творчасці пад кіраўніцтвам вядомага дырыжора і кампазітара Майсея Шнеера рыхтуе да свята «Песню аб Сталіне» А. Хачатурана. Гэта песня ў дні кастрычніцкіх урачыстасцей будзе выконвацца хорам у суправаджэнні сімфанічнага аркестра Беластоцкай філармоніі. Хор Шнеера развучвае таксама ўрыўкі з оперы А. Туранкова «Кветка шчасця».

Дзейсна рыхтуюцца да свята гродненскі хор яўрэйскай народнай песні пад кіраўніцтвам Вігдаровіча і скідзельскі беларускі хор.

# Экспазіцыя выстаўкі „Ленін і Сталін— арганізатары беларускай дзяржаўнасці“

У дні XXIII гадавіны Вялікага Кастрычніка будзе падведзен вынік натхнёнай творчай працы мастакоў Савецкай Беларусі, адкрыецца выстаўка «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Вось яна—выстаўка, на якой мастакі расказваюць аб велічы партыі Леніна — Сталіна, партыі, вывеўшай беларускі народ, як і ўсе шматнацыянальныя народы былой Расійскай імперыі, з ціскоў бяспраўя і цемры на светлы шлях сацыялізма.

З левага боку ад цэнтральнага ўваходу велізарнае панно на тэму «Лявоніха», над якім доўга працавалі лепшыя вышывальшчыцы рэспублікі, выкарыстаўшыя ўсю гамму багацейшых матываў беларускіх тканін і народных вышывак, — яно красачна расказвае аб шчаслівым сёння беларускага народа.

***

Вы зайшлі ў **першы** аддзел выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Жывапісныя палотны і графічныя рысункі знаёмяць вас з мінулым беларускага народа, расказваюць аб сацыяльным і нацыянальным прыгнёце, панаваўшым у дарэвалюцыйнай Беларусі.

Карціны Ю. М. Пэна, Л. Альпяровіча, А. М. Бразэра, якія паказваюць затхлы быт старога мястэчка, беспрасветнае жыццё яўрэяў-саматужнікаў. Рысункі і акварэлі мастакоў Малкіна, Геніна, Філіповіча, Мільчына, Тарасікава на тэмы: «Араты», «Старая вёска», «Дудар», «Стары» прымушаюць вас прыгадаць радкі з «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну»:

А было нядаўна, а было калісьці,
Калі мы з зямелькі не мелі карысці, —
Папалам дзялілі, пад адным прымусам,
Гора і галечу яўрэй з беларусам.

Скульптура з дрэва «Лірнік», зробленая заслужаным дзеячом мастацтваў ордэнаносцам А. В. Грубэ, выражае смутак прыгнечанага беларускага народа. Але гэты народ не быў пасіўным, бязвольным.

Малады мастак Давідовіч у фігуры на першым плане карціны «Курлоўскі расстрэл» выдатна паказаў прадстаўніка беларускага народа, стойкага і загартаванага ў барацьбе з адвечнымі ворагамі—з панамі і царскімі душыцелямі, а вялікая скульптура з дрэва «Беларус» Грубэ дапаўняе характарыстыку аб народзе, поўным пратэсту і барацьбы супроць сваіх прыгнятальнікаў.

...Мы знаходзімся ў **другім** аддзеле: «Беларусь у перыяд Кастрычніка». І ў памяці ўстаюць тыя незабыўныя дні, калі пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі працоўныя масы ішлі на штурм капіталістычнай цвярдыні. Беларусь тады была арэнай дзеянняў розных варожых сіл. Урад Керэнскага акружыў Мінск контррэвалюцыйнымі атрадамі. Партыя Леніна—Сталіна пасылае лепшых сваіх сыноў для арганізацыі барацьбы беларускага народа супроць ворагаў Кастрычніка.

Вось мастацка зробленае палатно на тэму «Выступленне Свярдлова на гістарычным пасяджэнні ЦК партыі бальшавікоў 10 кастрычніка 1917 года», тав. Свярдлоў інфарміруе аб становішчы ў Мінску. Заслужаны дзеяч мастацтваў ордэнаносец В. В. Волкаў уклаў у гэту работу шмат пачуцця, ім любоўна абрысаваны ўдзельнікі пасяджэння—геніі рэвалюцыі Ленін і Сталін і іх саратнікі. Л. М. Кагановіч кіруе раззбраеннем карнілаўцаў у Гомелі, умацоўвае Саветы ў Магілеве. М. В. Фрунзе ў Мінску стварае першыя органы ўлады,—гэтым тэмам прысвяцілі свае творы мастакі Ахрэмчык, Малец, Гаўрыленка, Берзін, Мірынгоф, Гардон.

Падрыхтоўка да выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці» натхняла мастакоў, узнімала іх на стварэнне праўдзівых па творчаму замыслу карцін. Хвалюючыя пачуцці перададзены ў работах многіх майстроў жывапісу. Вось твор Е. Ціхановіча «Выступленне Серго Орджанікідзе на 2-м з'ездзе армій Заходняга фронта». Дадзен вольны эпізод, які адносіцца да 20-х чыслаў лістапада 1917 года. З'езд адбываўся ў Мінску. Складаны партрэт незабыўнага Серго ў канкрэтнай гістарычнай абстаноўцы добра зроблен маладым аўтарам. Вось першая кампазіцыйная работа Гаўрыленкі «Затрыманне карнілаўскіх эшалонаў у Гомелі і іх раззбраенне пад кіраўніцтвам Л. М. Кагановіча». Гэта карціна, як і многія іншыя, будзе карыстацца несумненным поспехам. Арыгінальна задумана і ажыццёўлена гістарычная тэма, узятая мастаком Шаўчэнкам,—«Выступленне Д. З. Мануільскага ў Гомелі ў 1918 годзе». Выгнаныя з мітынга эсэры дадзены таленавітым мастаком тыпова, абагулена.

Велізарнае ўражанне робіць вялікая карціна «Выступленне Я. М. Свярдлова на 1-м Усебеларускім З'ездзе Саветаў» работы маладога мастака Ліўшыца.

У вялікай манументальнай скульптуры «Ленін і Сталін» работы заслужанага дзеяча мастацтваў ордэнаносца З. І. Азгура перададзены глыбокія пачуцці любві і адданасці беларускага народа да вялікіх правадыроў партыі.

І вось мы любуемся шматлікімі работамі жывапісцаў, скульптараў, графікаў у **трэцім** аддзеле выстаўкі, які расказвае аб барацьбе народаў БССР супроць белапольскіх акупантаў. Цэнтральнае месца займае вялікая карціна мастака-ордэнаносца Н. А. Пашкевіча «Беларускія партызаны на прыёме ў таварыша Сталіна». Аўтар глыбока і праўдзіва рысуе баявую і аператыўную абстаноўку штаба, які пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна праддрашыў разгром белапалякаў. Любоў беларускага народа да правадыра знайшла сваё выражэнне ў агульнай кампазіцыі, у жыццёвай трактоўцы задуманай тэмы. У сэнсе агульнага каларыту, у абрысоўцы людзей, у самым фоне карціны ёсць шмат падкупляючага, цёплага, што прымушае гледача доўга ўглядацца ў гэтае, выключнае па майстэрству палатно.

Малады мастак Красоўскі напісаў карціну «Сталін і Орджанікідзе ў Рэўваенсовеце Заходняга фронта» у якой адчуваецца эпоха, героіка мінулага.

Роля Орджанікідзе ў барацьбе з белапалякамі абрысавана ў скульптурных групах маладых майстроў Орлова — «Сталін і Орджанікідзе» і Жорава—«Орджанікідзе ў разведцы пад Барысавам». Знішчальны разгром белапалякаў быў падрыхтаван бліскучым ударам нашай слаўнай конніцы. Гэта цудоўная эпапея грамадзянскай вайны ўвасоблена ў невялікай скульптуры Глебава і ў серыі жывапісных работ мастакоў Гедда, Курачкіна і Пікуса пад агульнай назвай «Варашылаў і Будзённы на Паўднёва-Заходнім фронце».

У чэрвені 1919 года ўсерасійскі стараста М. І Калінін з агітацыйным поездам прыбыў у Мінск, прымаючы ўдзел у провадах рэвалюцыйных атрадаў рабочых і сялян на фронт супроць белай Польшчы. Гэты момант дадзен у вялікім палатне работы мастака Н. І. Гусева.

Перамогу бальшавіцкай партыі і ўсяго народа над ворагамі савецкай улады адлюстроўвае велізарная карціна мастака-ордэнаносца Е. А. Зайцава. Яна пакідае ў гледача незабыўнае ўражанне сваёй праўдзівасцю, свежасцю і багаццем фарбаў, адчуваннем урачыстасці народа-пераможца.

З гэтага, як і з папярэдняга аддзела, глядач выходзіць з пачуццём глыбокай радасці за сваю радзіму, за вялікую дружбу народаў, дзякуючы якой працоўныя масы БССР маглі выгнаць акупантаў і прыступіць да мірнага сацыялістычнага будаўніцтва. Але асабліва помніць глядач безупынную ўвагу да Беларусі з боку яе тварцоў і арганізатараў—вялікіх геніяў чалавецтва Леніна і Сталіна. Фарміраванню маладой рэспублікі ў годы Кастрычніка і абароне Беларусі ад паноў у годы грамадзянскай вайны дапамаглі пасланцы партыі Леніна—Сталіна — таварышы Орджанікідзе, Свердлаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Будзённы, Мануільскі і рускія рабочыя і сяляне ў чырвонаармейскіх шынелях, якія разам з беларускім народам умацоўвалі ўладу Саветаў.

Вельмі жывапісна і багата прадстаўлен **чацверты** аддзел выстаўкі, які прысвечан сацыялістычнаму будаўніцтву ў БССР. Тут шмат скульптурных і жывапісных партрэтаў Сталіна. Асабліва вылучаецца вялікая скульптура «Сталін—тварэц канстытуцыі» работы Азгура, бюст Сталіна, аўтарам якога з'яўляецца таленавіты скульптар Беластока тав. Мессер, і барэльеф-медальён «Сталін» работы заслужанага дзеяча мастацтваў ордэнаносца М. А. Керзіна, Тут-жа бюст настаўніка-ордэнаносца Голуба работы заслужанага дзеяча мастацтваў А. М. Бразэра.

Індустрыя нашай рэспублікі, стаханаўскі вопыт работы, квітнеючая сельская гаспадарка, цудоўныя пейзажы беларускай прыроды, тэмы мацярынства, фізкультуры, рэканструкцыі гарадоў, каляровыя лінагравюры аб новым Мінску, заможнае і культурнае жыццё народа,—усё гэта поўна і прыгожа паказана ў шматлікіх і таленавітых творах мастакоў Беларусі і яе ўраджэнцаў, якія жывуць у Ленінградзе і Маскве. Прыцягваюць да сябе ўвагу работы Ахрэмчыка, Лейтмана, Дакальскай, Зевіна, Дучыца, Гольдрэя, Кудрэвіча, Тарасікава. Гравюры і манатыпіі аднаго з лепшых графікаў БССР С. Б. Юдовіна, прысвечаныя новаму Віцебску, і Тычыны аб новым Мінску—вельмі цікавы, у іх мастакі цёпла перадаюць стыль перабудоўваючагося сацыялістычнага горада. Прыцягвае ўвагу серыя работ мастакоў Мільчына на бытавыя тэмы («Прыезд сына», «Тучнае поле» і інш.), пераклікаюцца з ім у гэтым жанры мастак Малец («Падрулі»), Далжанскі («Гулянне моладзі»).

Гістарычнай падзеі—вызваленню народаў Заходняй Беларусі прысвечан **пяты** аддзел. У ім мастакі заходніх абласцей, якія далучыліся да савецкага выяўленчага мастацтва, з вялікім тэмпераментам і сілай (Краеўскі, Цібер, Ляндаў, Малярэвіч) рысуюць змрочнае мінулае народаў пад ярмом польскіх паноў і памешчыкаў і радасныя дні з'еднання беларускага народа ў адну дзяржаву рабочых і сялян. (Петразаводскі, бр. Зайдэнбойтэль, Мазалёў, Кшэчаноўскі і шмат іншых). Выдатнымі па майстэрству работамі з'ўляюцца скульптурная група «Вызваленая Заходняя Беларусь», вылепленая таленавітым мастаком Н. Я. Рапапортам, вялікае палатно мастака Масквы Модорава — «Народнае Сабранне» і з цеплынёй зробленая карціна ордэнаносца Манасзона «Сустрэча танкістаў». Вельмі добры барэльеф на гэту-ж тэму работы заслужанага дзеяча мастацтваў А. О. Бембеля.

Заключным акордам выстаўкі з'яўляецца **шосты** аддзел на тэму: «Беларусь — несакрушальны фарпост сацыялізма на заходніх рубяжах СССР». Народы ордэнаноснай рэспублікі добра памятаюць указанні таварыша Сталіна наконт капіталістычнага акружэння і прымаюць неабходныя меры выцякаючыя з гэтага ўказання. Ужо вядомая скульптурная група Орлова «Пагранічнік і калгасніца», скульптура Рыттэра «У дазоры», серыя выдатных акварэляў мастака Лейтмана на тэму «Жыццё, вучоба і быт Чырвонай Арміі»—узбагачаюць аддзел, у мастацкай форме выражаючы гатоўнасць народа абараняць савецкія рубяжы ад любога ворага. Партрэты Герояў Савецкага Саюза (у скульптуры) Копеца, Грыцаўца, работы З. Азгура, карціна Беляніцкага «Лыжны спорт у Чырвонай Арміі», вялікае палатно мастака Зальцмана «Дзень авіяцыі», невялікая скульптура Эйдэльмана «Гранатамётчык» і рад іншых твораў дапаўняюць гэты раздзел, надаючы яму патрэбную закончанасць у адлюстраванні такой тэмы, як абарона нашай вялікай сацыялістычнай радзімы.

***

Можна было-б даць будучаму наведвальніку выстаўкі спецыяльнае апісанне шматлікіх твораў народнай творчасці багатых у сваёй рознастайнасці (рысункі, лепка, інкрустацыя, вышыўкі, разьба па дрэву і металу, аплікацыі і інш.) і аддзела архітэктурных збудаванняў. Але гэтыя раздзелы патрабуюць спецыяльнага разбору.

Выстаўка «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці» па багаццю экспанатаў, а іх каля 900, прадстаўляе сабою выключную з'яву ў жыцці беларускага выяўленчага мастацтва. Выстаўка з'явіцца наглядным дапаможнікам для тых, хто вывучае гісторыю барацьбы працоўных краіны Саветаў за справу Леніна-Сталіна. Выстаўка ў той-жа час з'яўляецца аглядам нашых дасягненняў ва ўсіх галінах выяўленчага мастацтва. Яна будзе этапам у падрыхтоўцы беларускіх мастакоў да Усесаюзнай выстаўкі «Наша радзіма» у 1942 годзе, прысвечанай 25-годдзю савецкай улады.

І. РУБІНШТЭЙН.

## СХОД ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ МАСТАКОЎ

21 кастрычніка адбыўся адкрыты сход партыйнай арганізацыі Саюза савецкіх мастакоў БССР з удзелам беспартыйнага актыва. Сход заслухаў даклад старшыні праўлення саюза тав. Рубінштэйна аб рабоце Саюза мастакоў за 1939—1940 год.

Гэтыя два годы ўся работа Саюза мастакоў падпарадкоўвалася задачы падрыхтоўцы да тэматычнай выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці». Незвычайнай і радаснай падзеяй у жыцці мастакоў была дэкада беларускага мастацтва ў Маскве. Выстаўка выяўленчага мастацтва, паказаная ў часе дэкады ў Маскве, прыцягнула ўвагу лепшых майстроў рускага народа да маладога, але таленавітага мастацтва Савецкай Беларусі. Выстаўка работ беларускіх мастакоў у Маскве атрымала высокую ацэнку IV пленума Аргкамітэта Саюза мастакоў СССР. Урад СССР узнагародзіў выдатных майстроў выяўленчага мастацтва БССР ордэнамі Саюза.

Гэты год быў асабліва плённым. Мастацкі совет і выставачны камітэт у якіх прымалі ўдзел усе члены праўлення Саюза савецкіх мастакоў правялі вялікую работу з мастакамі па падрыхтоўцы да выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці». На гэтай выстаўцы маладыя мастакі тт. Андруховіч, Бржэзоўскі, А. Кроль, Жораў, Гаўрыленка, Касмачоў і інш. упершыню выступаюць з кампазіцыйнымі творамі.

Але вынікі работы мастакоў маглі быць значна лепшымі, калі-б добра працавала праўленне саюза. Секцыі саюза за апошні час спынілі сваю работу. Праведзеныя кваліфікаванымі лектарамі СССР 17 лекцый па выяўленчаму мастацтву далі мала практычных вынікаў, бо ў большасці яны праводзіліся скараспела, беларускія мастакі не рыхтаваліся да іх. Створаны для мастакоў лекторый наведваецца слаба. З 70 членаў і кандыдатаў саюза савецкіх мастакоў па Мінску займаецца вывучэннем «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» не больш 15 чалавек. Адсутнасць сталага палітычнага, ідэйнага выхавання мастакоў значна адбілася на рабоце саюза, на работах мастакоў.

У сваім дакладзе тав. Рубінштэйн гаварыў і аб тым, што старэйшыя мастакі выдатныя майстры тт. Керзін і Волкаў не далі у апошні час такіх новых работ на якіх магла-б вучыцца моладзь.

Пасля справаздачнага даклада тав. Рубінштэйна разгарнуліся актыўныя спрэчкі. Скульптар тав. Бразэр гаварыў аб тым, што на выстаўку «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці» трэба адбіраць толькі тыя творы, якія маюць поўную мастацкую каштоўнасць. Мастак тав. Тарасікаў адзначыў, што Саюз мастакоў недастаткова кіраваў работай секцый. Ні адна секцыя мастакоў не працавала.

Жывапісец тав. Красоўскі гаварыў аб слабай рабоце саюза па выхаванню маладых таленавітых кадраў.

Вельмі цікавымі былі выступленні мастакоў тт. Зайцава, Азгура, Грубэ, Керзіна. Усе яны сышліся на думцы, што праробленай Саюзам мастакоў работай задаволіцца нельга. Поспехі мастакоў былі-б значна большымі, калі-б партыйная арганізацыя, Саюз мастакоў па-сапраўднаму наладзілі ідэйна-палітычнае выхаванне мастакоў, авалоданне імі тэорыяй Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна. Не заўсёды ў цэнтры ўвагі саюза было пытанне вырошчвання новых таленавітых маладых кадраў—скульптараў, жывапісцаў, графікаў. Нічога не зрабіў саюз па выхаванню і вылучэнню з свайго асяроддзя крытыкаў выяўленчага мастацтва.

Скульптар тав. Грубэ ўнёс прапанову ў бліжэйшы час абмеркаваць па секцыях работы, прадстаўленыя на выстаўку, шырока разгарнуць абмеркаванне пытання аб стварэнні ў скульптуры і жывапісу вобразаў савецкіх людзей, у прыватнасці вобразаў бальшавіка, пабудаваць сваю работу так, каб уславіць у манументальных творах эпоху сацыялістычнага росквіту Савецкай Беларусі, сваёй радзімы і яе герояў.

А. АСТРЭЙКА.

*М. Модэль*

# Паэма аб каханні

Балет, бышь можа, больш, чым якое іншае мастацтва, вядзе нас у прывабны, інтымны свет пачуццяў. Балеты П. І. Чайкоўскага даюць прастор росквіту чалавечых пачуццяў, чалавечай асобы. Тэма чалавечай асобы праходзіць праз усе творы геніяльнага рускага кампазітара. Тонкі пы псіхолаг, Чайкоўскі глыбока пранікае ў свет перажыванняў і пачуццяў сваіх герояў, яго музыкальная мова надзвычайна шчырая, непасрэдная, эмацыянальная. Кампазітар пісаў: «Мне здаецца, што я сапраўды адаран уласцівасцю праўдзіва, шчыра і проста выражаць музыкай пачуцці, настроі і вобразы...»

У творчасці Чайкоўскага балет не быў пабочным, другарадным элементам. Яго балеты не маюць нічога агульнага з «музыкай для ног» Пуні і Мінкуса. Пра любоў Чайкоўскага да балета мы можам меркаваць па яго адносінах да «Сільвіі» Дэліба: «Я чуў балет «Сільвія» Дэліба, іменна **чуў,** таму што гэта першы балет, у якім музыка не толькі галоўны, але і адзіны інтарэс. Што за прыгажосць, што за хараство, багацце меладычнае, рытмічнае і гарманічнае».

«Лебядзінае возера» — першы балет геніяльнага кампазітара, балет лірычна-сімфанічны; напісан ён у «вясенні» перыяд жыцця і творчасці Чайкоўскага (1875 — 1876). Казачны свет «Лебядзінага возера» разам з тым і «рэальна-псіхалагічны».

У паэтычных вобразах балета ёсць адчуванне рэальнага жыцця. Тэма кахання, паэзія гэтага велізарнага і чыстага чалавечага пачуцця ўзнята кампазітарам да сапраўднага трагічнага пафасу.

Найвыдатнейшы ўзор балетнай класікі, «Лебядзінае возера» дае адказ на многія творчыя спрэчкі, якія адбываюцца зараз сярод майстроў балета і крытыкаў.

Што такое балет, — пытаюцца сучасныя крытыкі, — рухаючыйся жывапіс, ажыўленая скульптура, ці «ігра танцам»?

Адказ на гэтыя спрэчкі мы знаходзім у пастаноўцы балета «Лебядзінае возера» Марыусам Пеціпа і Львом Івановым. Лірыка-сімфанічны танец і ігра танцам былі пануючай стыхіяй гэтага спектакля. Танец развіваўся ў ім моцным патокам праўдзівых эмацыянальных і пластычных вобразаў. Душой гэтага спектакля быў рускі балетмейстар Леў Іваноў. У пастаўленай ім другой і чацвёртай карціне бязмежна панавала стыхія танца. Кампазіцыя гэтых карцін, «лейтрухі» танца, усе па, фігуры, позы і ходы раскрывалі драму і рух эмацыянальных канфліктаў балета. Арабескі і атцітюды, піруэты і жэтэ, батманы і шэнэ—багатая і рознастайная харэаграфічная мова служыла ігры танцам і танцавальнай характарыстыцы вобразаў. Усе далейшыя пастаноўкі «Лебядзінага возера» ішлі пад мастацкім уплывам цудоўнага тварэння Пеціпа і Іванова.

Спектакль Дзяржаўнага ордэна Леніна тэатра оперы і балета БССР (пастаноўка К. А. Мулера, мастак С. К. Самахвалаў, дырыжор Н. С. Балазоўскі) пастаўлен у духу традыцый рускай балетнай класікі. Многае ў танцавальнай мове гэтага спектакля ад высокай культуры Пеціпа і Іванова, асабліва ў другой і чацвёртай карцінах балета.

Ёсць у спектаклі ўдалыя масавыя і ансамблевыя танцы, пастаўленыя А. К. Мулерам. Кампазіцыя другой карціны балета зроблена ў стылі і пад уплывам Пеціпа і гэта карціна вылучаецца сваёй мастацкай цэльнасцю. Любоўны дуэт і, у прыватнасці, яго першая частка — адажыё на фоне гарманічных ліній масавага танца лебедзяў — гранічна жывапісны і прыемна лашчыць зрок.

Балетная класіка ў «Лебядзіным возеры», танцы, якія выконваюцца кордэбалетам, не так бездапаможны, як у першай рэдакцыі гэтага спектакля, пастаўленай на малай сцэне.

Прыемны па кампазіцыі танец чацвёркі лебедзяў, жартаўлівы танец трэцяга акта, а з нацыянальных танцаў найбольш удалы — іспанскі — простыя па сваіх «па» і разам з тым даволі дынамічныя.

Шкада, што няма цэльнасці і адзінай думкі ў кампазіцыі спектакля, у музыкальна-сцэнічным увасабленні геніяльнага балета Чайкоўскага, — думкі, якая-б зніто́ўвала ўвесь твор.

Зноў, як і ў мінулай пастаноўцы балета Мулерам, першы акт спектакля не зусім арганічан астатнім тром. Надумана ружова-сантыментальная канцоўка спектакля, нечаканая, не вынікаючая з музыкальнай драматургіі і партытуры балета. Не ўсе танцы ў спектаклі з'еднаны яснымі і апраўданымі мізансцэнамі, многія з танцаў з прычыны гэтага «сюітны» па сваёй форме. Бясцветна балетнае трыё першага акта, за выключэннем варыяцый салістак Багданавай і Сямёнавай. Не адчулі мы ўсёй гукавай прыгажосці і велізарнай эмацыянальнай глыбіні музыкі балета, якая ў партытуры сімфанічна да апошняга такта. Вельмі ўжо плаўна і спакойна гучыць аркестр. Няма тут бурных узлётаў чалавечага духу, «светлага суму» і драматызму, якімі насычана музыка.

І ўсё-ж мы былі зачараваны спектаклем. Нас захапіла і ўзрушыла цудоўнае танцавальнае майстэрства выканальніцы цэнтральнай партыі балеты—Одэтты—Зінаіды Васільевай. З першага выхаду З. Васільевай у адажыё другой карціны, і да канца спектакля сэрца і ўсе думкі гледача аддадзены балерыне.

Танец З. Васільевай віртуозны, рытмічны, класічна строгі і да скульптурнасці рэльефны па свайму рысунку. Кожная фігура, па, поза, кожны рух балерыны з'яўляюцца стылем і школай класічнага танца.

Народная артыстка БССР Зінаіда Анатольеўна Васільева ў балеце «Лебядзінае возера». Фото І. Каплінскага.

Балерына пластычна і музыкальна. Танец напаўняе ўсю істоту балерыны — ногі, корпус, плечы, нават кісці рук. Танец З. Васільевай, яе чароўны па прыгажосці «плывучы» арабеск, піруэты, шэнэ і жэтэ насычаны актыўным, волевым драматызмам і заўсёды адухоўлены. Цудоўнай балерыне не ўласцівы лірычна-бязвольны сум, свет пасіўных, сузіральных пачуццяў, «блокаўскія» матывы ў танцы. Свет пачуццяў З. Васільевай — страсны, тэмпераментны.

Велізарны талент і танцавальная культура З. Васільевай даюць права параўноўваць яе з лепшымі танцоўшчыцамі. Танцавальны тэмперамент З. Васільевай бліжэй да «знойнага» тэмпераменту Фанні Эльслер, чым да «чароўнай меланхоліі рухаў» і «бездапаможнай грацыі» Марыі Тальоні і да акварэльных фарбаў танца Галіны Уланавай. Агульнае паміж Васільевай і Тальоні тое, што і Васільева «царыца паветра» і «жывое ўвасабленне стройнасці і лёгкасці». Мы згодны з крытыкам В. Патапавым, які лічыць палёт З. Васільевай непаўторным выяўленнем выключнай артыстычнай індывідуальнасці балерыны.

Леанардо да Вінчы неяк пісаў: «Позы ўдзельнікаў павінны быць такімі, каб рухі іх рук і ног выяўлялі імкненне іх душ». «Імкненне душы» мы адчуваем у позах і палётах З. Васільевай. На спектаклі «Лебядзінае возера» мімаволі ўспамінаеш паэтычна ўзвышаныя словы, якія былі накіраваны А. С. Пушкіным па адрасу рускай Тэрпсіхоры-Істомінай, у якой паэт убачыў «душой исполненный полет»:

Блистательна, полувоздушна,
Смычку волшебному послушна,
Толпою нимф окружена
Стоит Истомина, она
Одной ногой касаясь пола,
Другою медленно кружит,
И вдруг прыжок, и вдруг летит,
Летит как пух от уст Эола;
То стан совьет, то разовьет
И быстрой ножкой ножку бьет.

Піруэт і палёт З. Васільевай, выключны апломб, сіла і ўпэўненасць яе танца заслужылі-б у геніяльнага рускага паэта не менш захапляючую ацэнку. Віртуозную танцавальную тэхніку З. Васільевай можна параўнаць з тэхнікай Марыны Сямёнавай і Ніны Дудзінскай.

Але параўнаннямі нельга поўнасцю выявіць індывідуальнасць танцоўшчыцы. Многа агульнага ў З. Васільевай з лепшымі танцоўшчыцамі, але галоўнае ў непаўторнасці яе тэмпераменту, ва ўласным увасабленні тэмы, вобраза, у пошуках уласнай манеры ў танцы.

З. Васільева ўвасабляе каханне як магутную страсць, закліканую перамагчы ўсе **перашкоды** на сваім шляху, як страсць, якая запаўняе усю істоту чалавека «да дна». Яе Одэтта—магутная чалавечая асоба-жанчына, здольная на змаганне за сваё пачуццё.

Паўната жыццёадчування, уласцівая балерыне, становіцца ўнутранай тэмай усіх выкананых ёю партый. І Одэтта Васільевай — казачная, рамантычная дзяўчына-лебедзь, з'яўляецца носьбітам рэальных страсцей. Нават у хвіліны найбольшага смутку і пакут, калі слаба трапечуць крылы лебедзя і нізка схіляецца долу галава, адчуванне полымя страсці, якое поўніць душу Одэтты, не пакідае гледача.

Актыўна-драматычны, дзейсны план харэаграфічнага ўвасаблення партыі Одэтты З. Васільевай палемізіруе у спектаклі з Зігфрыдам — К. Мулерам.

Зігфрыд — Мулер іншага плана, чым Одэтта—Васільева.

Актыўна-драматычнай Одэтце ў сцэнах супрацьстаўлен галантны лірыка-сантыментальны Зігфрыд. Мулер — Зігфрыд у сцэнах іншы, чым у танцы.

Мулер танцуе бездакорна. Яго прыжкі, баллон, варчэнні выконваюцца мякка з пачуццём мастацкага такту. Асабліва пранікнёна, дынамічна і мякка выконвае ён варыяцыю трэцяга акта. Але Мулер у сцэнах не імкнецца перамагчы традыцыю галантнага, крыху манернага балетнага кавалера. Нават «падтрымка» партнёршы яго не заўсёды ўдалая. Рознасць манер Одэтты і Зігфрыда адчувальны і ў любоўных дуэтах.

Ад душы жадаем К. Мулеру большай самастойнасці і навізны ва ўвасабленні вобраза Зігфрыда. Геніяльная музыка Чайкоўскага дае шырокі прастор для рознастайнага тлумачэння партыі.

Партыю Одыліі — дэманічнай і ракавой жанчыны з рэзкімі і бурнымі страсцямі — танцуе А. В. Нікалаева.

Артыстка даволі лёгка выконвае тэхнічна цяжкія трыццаць два фуэтэ і ўсю складаную варыяцыю трэцяга акта. Нікалаева танцуе, хоць і без асаблівага бляску і віртуознасці, але мякка, з пачуццём мастацкай меры. Выразная міміка дапамагае артыстцы ў раскрыцці перажыванняў і ўнутранага стану «дэманічнай» Одыліі. Вобраз Одыліі знаходзіцца ў стылі спектакля і з'яўляецца бясспрэчнай удачай артысткі.

У адажыё першага акта вылучаецца салістка Драспель — свежасцю, непасрэднасцю і лёгкасцю танца.

У балетным трыё першага акта добры танцавальны тэмперамент у салісткі Сямёнавай.

Адухоўлена, з цудоўнай жаночасцю выконваецца варыяцыя ў па-дэ-труа салісткай Багданавай. У танцы Багданавай многа мяккіх акварэльных, мабыць, нават уланаўскіх фарбаў.

Нечакана і прыемна ўзрадаваў нас у гэтым спектаклі малады саліст Рэвера[illegible] ў танцы жартаўнікоў (трэці акт). У яго танцы многа гумару, шчырасці, непасрэднасці і лёгкасці.

Спектакль «Лебядзінае возера» не роўны. Ёсць у ім узоры вялікага майстэрства, ёсць многа і недасканалага. Бясспрэчна тое, што Тэатр оперы і балета — таленавіты творчы калектыў — ў новым спектаклі, як і раней, з незгасаючай энергіяй шукае новых, няпройдзеных яшчэ шляхоў у мастацтве.

*Трэці Пленум БРК саюза работнікаў мастацтваў БССР*

# ІДЭЙНА ВЫХОЎВАЦЬ РАБОТНІКАЎ МАСТАЦТВАЎ

21—23 красавіка адбыўся трэці пленум Беларускага рэспубліканскага камітэта Саюза работнікаў мастацтваў. У работах пленума прынялі ўдзел прадстаўнікі тэатраў, музычных школ, Саюза мастакоў, Дамоў народнай творчасці.

Пленум заслухаў справаздачны даклад старшыні камітэта тав. Арыярскага і цакесніка начальніка Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР тав. Ліберзона аб правядзенні ў жыццё Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня 1940 года.

З часу другога пленума прайшло толькі шэсць месяцаў. Тэрмін нязначны, але ў жыцці работнікаў мастацтваў нашай рэспублікі за гэты час адбыліся вялікія падзеі. Саюз работнікаў мастацтваў Совецкай Беларусі вырас за лік акцёраў, кампазітараў, мастакоў заходніх абласцей. Створана 27 нізавых профарганізацый, аб'яднаўшых 1.289 новых членаў саюза.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня з'явіўся асновай перабудовы ўсёй творчай і гаспадарчай дзейнасці прадпрыемстваў і калектываў мастацтваў. Ажыццяўленне Указа забяспечыла пашырэнне рэпертуарных планаў нашых тэатраў. Калі ў мінулыя годы тэатры выпускалі 3—4, самае большае 5 пастановак у год, дык у 1941 годзе рэпертуарныя планы тэатраў складаюцца з 8—10 пастановак. Значна павялічылася якасць спектакляў. Добрым прыкладам у гэтай справе з'яўляецца Дзяржаўны Яўрэйскі тэатр БССР, які раней не выконваў рэпертуарны план пры 4-х спектаклях у год. Цяпер тэатр перабудаваў сваю творчую работу, адначасна працуе над трыма п'есамі, своечасова выпускае пастаноўкі. Лепш стаў працаваць і Дзяржаўны Рускі тэатр БССР. З калгасных тэатраў трэба адзначыць Слуцкі, які і па выпуску спектакляў і па даходнай частцы поўнасцю выканаў свой вытворчы план.

Вынікі дэкады беларускага мастацтва ў Маскве служаць стымулам далейшага росквіту нашага мастацтва, уздыму ўсёй палітычнай, масавай і грамадскай работы ў калектывах работнікаў мастацтваў.—Нажаль, той уздым творчай работы, якім знаменавалася падрыхтоўка да дэкады, значна аслаб. Знізілася мастацкая вартасць спектакляў у Дзяржаўным ордэна Леніна тэатры оперы і балета БССР («Кветка шчасця», «Салавей»), паслабіў творчую работу і Дзяржаўны ордэна Чырвонага Працоўнага Сцяга драматычны тэатр БССР, які выпусціў пасля дэкады фальшывы спектакль «Страшны суд». Незразумелы і дзіўны адносіны кіраўнікоў гэтага тэатра да афармлення пастановак, якія былі прадстаўлены на дэкадзе. Зробленыя за 100 тысяч рублёў дэкарацыі спектакля «Пагібель воўка» загінулі з-за бесклапотнасці адміністрацыі. Абыякава адносіцца да гэтага і Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР. Заслужаны артыст БССР тав Бірыла ў сваім выступленні на пленуме правільна паставіў пытанне аб неабходнасці прыцягнення да судовай адказнасці тых, хто злачынна адносіцца да дзяржаўнай маемасці.

Аслабла пасля дэкады палітмасавая грамадская работа ў тэатрах. Мала дапамагае нізавым профарганізацыям у гэтай важнейшай справе БРК саюза, старшыня яго культмасавага сектара заслужаны артыст БССР тав. Моін. Трэба адзначыць, і тое, што многія партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі тэатраў зусім занядбалі справу ідэйнага выхавання творчых работнікаў сцэны, справу арганізацыі вывучэння «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», авалодання марксісцка-ленінскай тэорыяй. Зніклі з планаў МК калектываў лекцыі па гісторыі партыі, тэарэтычныя гутаркі і кансультацыі, спынілі працу і гурткі па вывучэнню «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Нельга забываць таго, што толькі той актор, які павышае свой культурны і палітычны ўзровень, можа быць сапраўдным майстрам совецкай сцэны, здольным паказаць на сцэне вобразы герояў нашага часу.

Адсутнасць патрэбнага ідэйнага выхавання прыводзіць да агідных, нецярпімых у нашым грамадстве антымаральных учынкаў, праяў багемы, што не можа быць сумяшчальна з высокім званнем совецкага актора. Выпадкі праяўлення багемы знаходзяць сабе месца нават у такіх тэатрах, як Оперны (актор Вепрынскі), Беларускі драматычны (актор Хацкевіч), Тэатр юнага гледача (актор Сурко). Мараль і этыка непасрэдна звязаны з творчасцю актора, з жыццём тэатра і не могуць быць «асабістай» справай. Сапраўдным выхавальнікам нашых гледачоў у духу камунізма можа быць толькі культурны, палітычна адукаваны актор, прыкладны грамадзянін Совецкага Саюза.

Не знайшла сабе месца ў рабоце БРК і Упраўлення па справах мастацтваў такая важная справа, як творчы агляд маладых акцёраў, які з вялікім поспехам прайшоў па ўсяму Совецкаму Саюзу. Агляд творчых сіл маладых акцёраў мае вялікае выхаваўчае значэнне ў жыцці нашых тэатраў, адкрывае перад нашай моладдзю перспектывы ў заўтрашні дзень. Нягледзячы на наяўнасць значнай колькасці маладых акцёраў у Мінскім драматычным, Віцебскім і іншых тэатрах, агляд моладзі па сутнасці не праведзен. Прыкладам безуважнасці да моладзі можа служыць і такі факт. Дырэктар Опернага тэатра тав. Гантман замест падтрымання і заахвочвання маладога таленавітага дырыжора Ратнера, удзельніка Усесаюзнага конкурса дырыжораў, здольнасці якога заслужана ацэнены пачотным дыпломам,— зволіў яго «па скарачэнню штатаў».

Запамяталі ў нас і аб калгасна-соўгасных тэатрах, якім асабліва патрэбна дапамога творчымі кадрамі. Упраўленне па справах мастацтваў, нягледзячы на спецыяльны загад Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР, дагэтуль не дапамагло гэтым тэатрам. У баку ад гэтай справы застаўся і БРК саюза работнікаў мастацтваў. Між тым, у мінскіх тэатрах дзесяткі маладых здольных актрыс зусім не загружаны работай.

Зараз па ўсяму Совецкаму Саюзу пачаліся справаздачы і выбары новых кіруючых органаў профсаюзаў. Няма сумнення, што гэтыя выбары работнікі мастацтваў Совецкай Беларусі сустрэнуць новым уздымам ідэйна-выхаваўчай і творчай работы.

**В. СТЭЛЬМАХ.**

# АБМЕРКАВАННЕ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛДЗЯРЖЭСТРАДЫ

23—24 кастрычніка адбылася, скліканая Упраўленнем па справах мастацтваў пры СНК БССР, нарада па пытанню рэпертуару эстрады. З дакладам аб задачах эстрады і дзейнасці Беларускай дзяржаўнай эстрады выступіў начальнік рэперткома тав. Гершэнзон. Дакладчык слушна крытыкаваў работнікаў Беларускай эстрады. Разам з гэтым дакладчык выказаў рад вельмі спрэчных, неабгрунтаваных думак пры вызначэнні характару эстрады, як жанру, і задач яе далейшага развіцця, пачаўшы агульна адмаўляць прыгоднасць для эстрады жанравай песні і іншых відаў вакальнай і музычнай творчасці. Досыць несур'ёзны ў «тэарэтычнай» частцы і ў аналізе практыкі работы Беларускай эстрады (адсутнасць аналізу і ацэнкі работы кіраўнікоў эстрады, шырокага разгляду рэпертуару і якасці выканання творчых работнікаў эстрады) даклад зрабіў пэўны ўплыў і на спрэчкі. Выступаўшыя больш палемізіравалі з дакладчыкам, чым абмяркоўвалі сутнасць пытання. Усё-ж рад выступаўшых — крытык тав. Кучар, кампазітар тав. Палонскі, тав. Цветкоў (Зах. АВА), тав. Жабкова (упаўнаважаны рэперткома па Віцебскай вобласці) і інш. зрабілі рад прынцыповых заўваг аб дзейнасці эстрады і ўнеслі канкрэтныя прапановы.

Халтура, пашлясціна яшчэ знаходзяць сабе месца на эстрадзе. Беларуская эстрада не мае арыгінальнага беларускага рэпертуару. Мала працуюць акторы эстрады над павышэннем свайго ідэйнага і культурнага ўзроўню, прафесіянальнага майстэрства. Дырэкцыя Беларускай эстрады (тав. Блюмберг) не займаецца творчымі пытаннямі. Разам з гэтым ёсць рад фактаў, якія сведчаць аб бесгаспадарчасці, аб парушэнні дырэкцыяй эстрады дзяржаўных законаў, фінансавай дысцыпліны. Няма патрэбнай увагі да эстрады і кантролю за яе дзейнасцю з боку Упраўлення па справах мастацтваў.

Калектыў работнікаў эстрады патрабуе рэжысёрскай дапамогі. На эстрадзе павінны сістэматычна выступаць лепшыя майстры тэатраў рэспублікі. Трэба заахвочваць пісьменнікаў і кампазітараў да работы па ўзбагачэнню эстрады арыгінальным рэпертуарам.

Выступаўшыя далей у спрэчках тт. Атрашчонак (Мазыр), Ларчанка (Магілеў), Кобрынскі, Мельнікаў (Зах. АВА), Казлоўскі (Магілеў), Новікава, Арыярскі, Шчэглоў спыніліся падрабязна на разглядзе творчай дзейнасці Беларускай эстрады, якасці рэпертуару, умовах работы акцёраў эстрады.

У заключэнне нарады выступіў начальнік Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР тав. Озірскі. Ён адзначыў, што на нарадзе трэба было падвесці вынікі праробленай Беларускай эстрадай работы за апошнія годы, намеціць шляхі далейшага развіцця эстраднага мастацтва. А гэтага, нажаль, не зроблена. Амаль адсутнічае ў эстрадзе беларускі нацыянальны рэпертуар. Далей тав. Озірскі адзначыў, што рэпертуар эстрады, песня гэта ці фельетон, павінен быць палітычна-насычаным, высокамастацкім, каб эстрадныя канцэрты выхоўвалі пачуццё патрыятызму, любві да радзімы, выхоўвалі соцыялістычныя адносіны да працы. Трэба наладзіць работу па ідэйна-палітычнаму выхаванню работнікаў эстрады, дапамагаць вырошчванню кадраў эстрады. У заключэнне тав. Озірскі ўказаў на тое, што работнікам эстрады мала аддае ўвагі крытыка.

**В. А.**



**Дэкада бурат-мангольскага мастацтва ў Маскве.** Артыст М. Машатаў у ролі пасла, артыст Б. Балдакоў у ролі хана і заслужаны артыст Бурат-Мангольскай АССР Ж. Пагбаін у ролі пасла ў оперы «Энхе — булат батор».

Фота М. Рунова (ТАСС).

*Адам Міцкевіч*

# ПАНІ ТВАРДОЎСКАЯ

**Балада**

П'юць, гуляюць, люлькі паляць,
Танцы, выгадкі, сваволле,
Ледзь карчмы той не разваляць:
Ха-ха! Хі-хі! Гэй-жа! Голя!

Пан Твардоўскі ўзяўся ў бокі,
Каля столу атаманіць:
«Шпар, панове! Свет шырокі!»
І чаруе, і туманіць.

Ён ваяку, што йграў зуха
І да ўсіх у бойку пяўся,
Свіснуў шабляй каля вуха —
І з ваякі заяц стаўся.

На юрыста з трыбунала,
Што смактаў мядок залацісты,
Бразнуў капшуком памалу —
І дварняга стаў з юрыста.

Шчоўкнуў тройчы ў нос шаўцовы —
Выбіў шпунт ударам лоўкім,
Поўны кубак крышталёвы
Нацадзіў сабе жытнёўкі.

Піць пачаў, ды чуе ціхі
Шум на дне ў кубку ўзняўся:
Заглядае. «Што за ліха!
Ты адкуль, кумок, узяўся?»

Чорцік там на дне таіўся,
Нібы немец — купаполы!
Грамадзе ён пакланіўся,
Скінуў шапку — і да долу

Скокнуў з кубка на падлогу.
Хоп! — расце на два аршыны, -
Нос даўгі, кручком, а ногі
У кіпцюрах у ястрабіных.

«А, Твардоўскі! Ну, як маеш?»
Праказаў прыемна дужа.
«Што? Хіба ўжо не пазнаеш?
Мефістофель я, мой дружа!

Мне пад Лысаю Гарою
Сваю душу запрадаў ты
І ўмову склаў са мною,
Што павінны чэрці заўжды

«Быць прыслугамі тваімі.
Праз два-ж годы, кажа ўмова,
Будзеш ты чакаць у Рыме,
Каб там здацца мне без слова.

«Аж і сем год прамінула,
І выходзіць так нягожа:
Пра цябе ўсё пекла чула,
А пабачыць і не можа.

«Толькі злосці не таім мы.
Час прышоў доўгачаканы:
Вось — карчма, завецца «Рымам», —
Тут і арыштую пана!»

Пан Твардоўскі — да парога,
Знікнуць спробуе раптова, —
Чорт загарадзіў дарогу:
«А дзе-ж панскі гонар, слова?»

Што тут зробіш? Вось папаўся,
Нат' загінуць давядзецца!
Ды Твардоўскі не спужаўся
І за хітрыкі бярэцца.

«Паглядзі ва ўмову, браце,
Так гаворыць тая ўмова,
Што мяне як будзеш браці —
Здамся я табе без слова.

«Толькі глянь у пункт дзесяты:
Маю права я, сардэчны,
Тры табе задаць загады,
Каб ты выканаў бясспрэчна.

«Вось, па першаму загаду,
На малюнку конік, бачыш?
Хай-жа на яго я сяду —
І па полю ён паскача.

«Каб быў конь віхроў не цішай —
Бізуна з пяску скруці ты,
А вунь там, Карпатаў вышай,
Дом збудуй, каб быў як зліты.

«Сцены з зернятак арохаў
Хай паўстануць над байракам,
А з барод яўрэйскіх страхі,
Густа ўсыпаныя макам.

«Гэты цвік вазьмі, хлапчына,
Каб быў меркай табе вернай:
Тры такіх забіць павінны
Ты ў макавае зерне!»

Чорт хутчэй каня сядлае,
Даглядае яго, поіць,
Бізуна з пяску звівае, —
Конь на месцы аж не ўстоіць.

Сеў Твардоўскі на гнядога,
Рушыў то хадой, то скокам,
Выязджае на дарогу —
Зірк — будынак перад вокам.

«Ну і сябра, вось дык праца!
Што-ж, кончай цяпер з другою.
Трэба ў міспы пакупацца
Са свячонаю вадою».

Мефістофеля аж трусіць,
Пот яго халодны крые, —
Ды пан кажа — служка мусіць! —
Лезе ў воду ён па шыю.

З міскі выскачыў як п'яны,
Пырскнуў: «пырск!» — сказаў лукава:
«Зроблена! Ты наш, мосьпане,
Бо няма цяжэйшай справы».

«Пачакай ты, спрытны дужа!
(Лопнуць дужасці бясоўскай!)
Баба вунь: знаёмся, дружа,
З жоначкай маёй Твардоўскай.

«Памяняцца я жадаю
Хоць на год адзін з табою:
Я — у пекле пагуляю,
Ты — пабудзь, як з жонкай, з ёю.

«Ёй на вернасць дай ты слова,
На павагу і пашану,
А зламаеш гэту ўмову —
Што-ж! Я зноўку вольным стану».

Чорт к яму схіліўся вухам,
На кабету кінуў вокам,
Нібы стаў уважна слухаць,
Ды да клямкі бокам, бокам...

Пан Твардоўскі — хоп за шкірку,
Затрымаць яго жадае...
Чорт-жа—шмыг!—ў замок, у дзірку...
І дагэтуль уцякае.

Пераклаў з польскай мовы
**К. ЦІТОЎ.**

# ПАМЯТИ ФРУНЗЕ

Текст П. Дружинина. Музыка М. Иванова.
















Были годы буйного размаха.
Бушевала на фронтах гроза.
Мне запомнилась его папаха
И простые, добрые глаза.

В Актюбинске, в злую студь перрона,
В разухабистый звенящий снег
Вышел он из жесткого вагона,
Этот непокорный человек.

И рабочих тесная громада
Окружила плотно—как и быть.

Говорил он все, что было надо,
Все, что надо было говорить

Про блокаду, про сыпняк, про голод,
Про победы,—и хвалил войска.
И казалось, что редеет холод
От горячих слов большевика.

И дивился я тогда немало,
Как же мог он на своем пути
Сквозь угрюмость каторжных централов
Эту радость, эту веру пронести.

## Літаратурны вечар

19 кастрычніка ў беластоцкім Доме пісьменніка адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны 30-годдзю літаратурнай дзейнасці пісьменніка-ордэнаносца Змітрака Бядулі.

З дакладам аб творчым шляху пісьменніка выступіў Максім Танк. Літгуртkoўцы — студэнты педагагічнага інстытута чыталі вершы і апавяданні Зм. Бядулі.

У павіншавальным пісьме да юбіляра пісьменнікі Беластока вітаюць аднаго з старэйшых песняроў беларускага народа і жадаюць яму новых творчых поспехаў на карысць радзімы.

*Ів. Грамовіч*

# ЦЫМБАЛЫ

Апавяданне

Напярэдадні палкавога вечара чырвонаармейскай самадзейнасці дзяжурны па батарэі Айвазаў прынёс паштовае паведамленне на пасылку Івану Будніцкаму. Чырвонаармеец Іван Будніцкі, родам з-пад Мінска, белакуры, яшчэ малады баец, у ленпакоі чытаў Устаў унутранай службы.

— Танцуй, Вань! — крыкнуў яму азербайджанец, усміхаючыся смуглявымі скуламі. — Пошта твая прынёс... Паведамленне!.. Танцуеш... А?

У Будніцкага ажыўлена бліснулі вочы, ён кінуўся да таварыша і выхапіў паведамленне. Яно ўсхвалявала. Адрас быў напісан неразборчыва, але па аднаму слову Будніцкі пазнаў почырк яе рукі. Ад таго, як яе рука вывела на кавалачку паперы гэтае слова, сэрцу яго стала горача і ў памяці пабеглі яркія ўспаміны.

Тады ў Беларусі стаяла пагодная восень. У далечы, на бяззоблачным небасхіле празрыста віднеліся сінія лясы. Раніца наставала ў гомане малатарань між гарбатых скірдаў аржанай саломы. На полі выбіралі бульбу. За млынам на лузе дзяўчаты падымалі адлежаны шэры лён.

Калі трактар Будніцкага ўзыходзіў на ўзгорак, Іван прыглядаўся на луг і заўсёды адрозніваў ад іншых хустку аднае дзяўчыны. Звалі яе — Надзя. Гэта было перад ад'ездам у армію. Іван развітаўся з ёю, і ў такую багатую восень, па вечарах напоўненую здаровым пахам спелых антонаўскіх яблыкаў, у такую радасную, залатую пару восені пры развітанні з Надзяй сэрца Івана злёгку агарнула туга.

Развітаўся яшчэ Іван з цымбаламі, што іграў вяселлі ўсяму сельсовету. Шырокія на ўвесь стол цымбалы — памяць нябожчыка дзеда Будніцкага. Цымбалы былі гучныя. Струны звінелі пералівамі, гукі не скора танулі ў дубовых грудзях цымбалаў. Пад рукою Івана басы маглі грымець, маглі ціха далятаць, як водгук. Іван любіў цымбалы. Ведалі ўсе, што любую песню, музыку ён у адзін момант пераймае на струны.

У жнівеньскі змрок пад ліпы калгаснага клуба, у гурт дзяўчат і хлапцоў, Іван прыносіў свае цымбалы і з гарманістам пачынаў карагод. Тады над цеснай ад моладзі танцавальнай пляцоўкай, над усім сялом, глыбока ў небе збіраліся, не мігаючы глядзелі мільёны зорак.

Помніцца апошні вечар. Дзевяць сыноў сваіх калгас выпраўляў у Чырвоную Армію. Быў развітальны банкет, уручалі прэміі, цалае свята спраўлялі. Неўгамонныя цымбалы грымелі, звінелі, ніхто Івана не супыняў — усе кружыліся ў вясёлым гулянні, ведалі, што заўтра ён ад'язджае, што няма каму ўзяць касцяныя палачкі ад іванавых цымбалаў.

— Можа, ты ўмееш? — запытаўся старшыня калгаса ў меншага Будніцкага.

— Магу, — бойка адказаў піонер.

— Іван навучыў?

Меншы Будніцкі злосна скасіў вока на брата, беручы ў рукі костачкі ад цымбалаў, адказаў:

— Ніколі ён не вучыў. Ён хаваў іх на паліцу, каб я не барабаніў... А я, як ён на полі, дастаю і іграю сабе...

— Ого! Бач, ты які?! — засмяяўся старшыня. — Ну, цяпер яны твае. Паспрабуй, брат, лявоніху.

З Надзяй, кінуўшы вечарынку, Іван быў ужо каля млына, а ўсё яшчэ чуў, як пад нагамі танцораў грукоча падлога ў калгасным клубе, як цымбалы ў руках меншага брата завіхаюцца патрапіць у такт гармоніка.

Чым бліжэй падыходзілі да млына, вечарынка заціхала, яе глушыла мяўклівая асенняя ноч. Яны супыніліся ля парэнчы на мосце. Адсюль відаць было, як за алешнікамі месяц рассцілаў халодны, белы туман.

— Ці ўсё сабраў у дарогу? — запыталася Надзя.

Іван Будніцкі толькі цяпер аб гэтым падумаў:

— А што там збіраць! — адказаў ён і, нахіліўшыся цераз парэнчу, стаў глядзець на люстраную гладзь ракі.

Як блізка ён апынуўся перад чаканай дарогай!.. Ён не думаў, не — ён і цяпер не думае аб гэтым. Вось імкнецца вада, плыве ліст па вадзе. Пад мастом у цені над вадой варушацца аеры. Гэта-ж рэчка плыве, рухаецца, рухаецца. А чаму спачатку здалося, што паверхня застыла і ўсё спіць?..

— Што ты ўгледзеў?—ласкава парушыла яго задуменне Надзя.

— Ваня, чаго ты так задумаўся?

Іван падняў галаву і пад святло месяца зірнуў у цёмныя вочы дзяўчыны.

— Ведаеш, што? Не хочацца пакідаць цымбалы.

— А ты іх з сабой вазьмі.

— Яшчэ што выдумай! — пагардліва перабіў ён. Памаўчаў, а тады, кранууўшы за руку дзяўчыну, пачаў заўзята гаварыць — ні-то ёй, ні-то ўгаварваць самога сябе.

— Ды ты падумай. Куды я вазьму іх? Гэта не дудка, што схаваў у сумку і не відаць.

Яго ўсхваляваную гаворку Надзя слухала і маўчала, не пярэчыла ні аднаму яго слову з тым, каб Івану самому было відней.

— Капітан прыезджы, чула, што гаварыў? — задумённа казаў далей Іван. — Артылерыя не простая штука. Яе да дробязі трэба вывучыць, а тады страляць. Вучыцца давядзецца многа... Трэба будзе глядзець аднаго.

Месяц поўны, чысты праменіў зялёнае святло над алешнікам, над полем, што драмала ў цішы асенняй яркасці. Іван казаў:

— Мне так не хочацца пакідаць. Ведаеш, Надзя, мне проста цяжка... І з сабою браць іх таксама нельга. Я ўжо думаў. Для чаго іх браць? Не для гэтага мяне туды клічуць, — і закончыў спакойна, у поўголаса: — Пакіну дома цымбалы...

А назаўтра ў сонечных вышынях зноў плыло над зямлёю павуцінне. Стаяла ясная восень. Іван адчуваў сябе спакойным, як чалавек, што закончыў усю работу, што пакідае ўсё ў парадку і чакае спаткаць новую працу размахам на ўсю сілу, у такі момант прыемна маўчаць, слухаць усё навакол, а калі цябе запытаюць, — адказаць што-небудзь добрае і вясёлае.

Знікла з вачэй агністая каліна на краю сяла. Іван сядзеў у кузаве машыны і глядзеў наперад, насустрач бадзёрым вятрам.

З гэтага дня пачалося жыццё ў арміі. Жыццё размеранае, баявое, у пэўных рамках. Сама форма вайсковага чалавека адразу неяк падцягнула, выпраміла, падраўняла ўсіх: шынель — у шынель, сотня — як адзін. На Івана, раней вольналюбівага, гэта налажыла пячаць, цяпер ён адчуваў сябе нібы звязаным. Але з кожным днём, чым глыбей Іван Будніцкі ўваходзіў у сям'ю — батарэю, гэта адчуванне слабела і знікала. У батарэі было многа прыехаўшых з Баку — азербайджанцаў. Дружныя хлопцы, чарнявыя, з маленькімі — для фасону — вусікамі, аказаліся палкімі сябрамі. Асабліва Іван падружыў з Мажуравым. Ён іграў на круглым, пасярэдзіне перапіснутым шары.

Аднойчы на вечары Мажураў з'явіўся на сцэне. З Іванам, які ў зале слухаў выступленне, пачалося тое, аб чым ён пазней пісаў у пісьме Надзі.

Мажураў узяў на рукі шар і, калыхаючы яго на грудзях, перабіраючы густыя струны, зайграў. Гэта былі песні азербайджанскіх гор, прыкаспійскіх абрываў.

Вочы Івана загарэліся агнём, яму здалося, што ён разам з музыкай плыве над галовамі сядзячых у зале. Дайце яго цымбалы! Грымнуць песні Беларусі, яе пагранічных вёсак, яе аксамітных лугоў, чырвоных калін-дзяўчат. Да болю пабіў рукі Іван у воплесках і выйшаў з залы, як пераможца.

Прышоў у казарму і напісаў дадому пісьмо, каб хутчэй прыслалі цымбалы, а Надзі — падрабязна, як танцавалі пад музыку сябры-азербайджанцы ў чорных джыгіт-касцюмах.

Іван ведаў лейтэнанта-канферанс'е, што кіраваў самадзейнасцю, і вырашыў з ім пагаварыць. Гэта былі крыху сарамяжлыя але палкія словы музыканта. Іван сустрэў лейтэнанта, нясмела, чырванеючы, сказаў:

— Я цымбаліст... Я іграю на цымбалах...

Сур'ёзны, заклапочаны лейтэнант паспешна праходзіў і, апынуўшыся каля Івана, сурова сказаў:

— Вы як стаіце, таварыш чырвонаармеец? Выньце руку з кішэні! Станьце, як належыць! Устава не ведаеце? Не ведаеце, як звярнуцца да камандзіра. Падумайце і далажыце, як патрэбна.

Іван, як громам аглушаны, застаўся адзін, нерухомы і збянтэжаны. Адзін момант ён нічога не разумеў. Пасля падумаў, вінавата ўсміхнуўся, паглядзеў навакол і накіраваўся ў бібліятэку. Вышаўшы адтуль, ён трымаў у руках Устаў унутранай службы.

Такімі былі першыя крокі. У Івана Будніцкага мімаволі знікала неарганізаванасць і наіўнасць.

А лейтэнант на другі дзень сам звярнуўся да Івана. На гэты раз Іван не пачырванеў.

І вось у руках паштовае паведамленне. Разам з цымбаламі ў пасылцы яшчэ была вышываная рознымі ўзорамі белая кашуля. І тут, у вышыванні, Іван пазнаў яе руку.

«Дарагая Надзя! — пісаў ёй Іван у пісьме пасля палкавога вечара самадзейнасці. — Я яшчэ ніколі не бачыў гэтулькі воплескаў. Мяне тры разы прымушалі іграць «Бадай таго каваля мяцеліца замяла». Еду выступаць у Маскву. Ад усяго палка я і Мажураў, пра якога я табе пісаў. Выступаў у вышыванай кашулі...»

У другім пісьме цераз месяц пісаў так: «Любая Надзя! І яшчэ пішу табе, што мяне тэрмінова пасылаюць у ваенную школу радые. Я вельмі рад што прайшоў камісію. Дактары прызналі слух выдатным. Буду вучыцца і вучыцца. Усе сілы, дарагая, аддам за радзіму. Калі буду ад'язджаць, дадаткова напішу. Вазьму абавязкова з сабой і цымбалы. Бывай, дарагая мая»...

Н-ская часць.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

У3662 Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва.

Мінск, друкарня «Звязды».